0244

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 5(9) **1936 г.** **Год II**



БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ ПАЭТ
ЯКУБ КОЛАС.

ВІЛЬНЯ 1936 ГОД

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы

Зьмест кніжкі 5(9) „Калосься“

Бачына

1. Міхась Машара: Хмары над Нёманам (верш) . 257—259
2. * * * На пройдзеным шляху (артыкул) . . . . . 260—276
3. Максім Танк: Тры песьні (верш) . . . . . . 277—279
4. Якуб Колас: Аўтобіографія . . . . 280—284
   З дарогі (верш) . . . . 285—286
   Дрыгва (повесьць) . . . . . . 287—289
5. Лаўрын Сяліба: Юбілей Клясыка — сьвята народу (артыкул) . . . . . 290—291
6. Ад. Станкевіч: У „палоне“ паэзіі Якуба Коласа (артыкул) . . . . 292—295
7. А. Уласаў: Якуб Колас і „Наша Ніва“ (артыкул-успаміны) . . . . 295—299
8. Максім Танк: Нарач (паэма, ч. IV) . . . . . 300—310
9. П М.: Сьвяткаваньне юбілею Коласа ў Менску . . 311—312

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя просіць ПТ сваіх супрацоўнікаў найхутчэй прысылаць літаратурны і навуковы матарыял да друку ў наступныя кніжкі „Калосься“.

Белар. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 5(9) **1936 г.** **Год II**

KSIĄŻNICA T-WA PRZYJACIÓŁ NAUK W WILNIE

МІХАСЬ МАШАРА

Хмары над Нёманам

пр. ЯКУБУ КОЛАСУ

І.

— Бура ідзе — сьцеражыцеся!
Нёмана хвалі шумяць, —
— Хто з вас гатоў —
адклікніцеся
Стоячы буру спаткаць!

Тысячы год я тут хвалямі
Б'юся і рву берагі,
Колькі ўжо песьнямі славілі
Шлях мой бурліва-даўгі.

Здаўна вас знаю, рахманыя
Дзеці маіх берагоў,
Вашу нядолю паганую
Столькі ўжо бачыў вякоў.

Песьні тужліва-балючыя
Так надакучылі мне, —
Сёньня бунтарна-кіпучыя
Думкі нясу на хрыбце.

Гэй дудары, мае лірнікі,
Дзе вы падзеліся, дзе?
Гляньце на вёскі-магільнікі, —
Грозная бура паўзе!

Дзе вы падзеліся звонкія?
Столькіх я тут гадаваў,
Хмары ізноў над старонкаю
Вецер шалёна нагнаў.

II.

Чорныя хмары павісьлі над вамі.
Шэрыя будні трывожна ідуць.
Злыдні заломы на шлях ваш радамі
Ў цемры трывожнай бяз спынку кладуць.

Хочуць каб спалі, як спалі вякамі,
Хочуць каб вечна служылі камусь,
Хочуць каб вера патухла ў народзе, —
Зноў каб жабрачкай была Беларусь;

Хочуць каб матцы у сумныя вочы
Родныя дзеці плявалі ізноў;
Здраду гадуюць, шукаюць ахвочых.
Сеяць атруту у душы братоў.

Хочуць ізноў, каб няволі пакора
Рабскай пячаткай лягла вам на твар,
Зноў стала цёмна, як ноччу у боры,
Зноў стаў патрэбным юдаш і гандляр.

Зноў каб блудзілі... на вошчуп рукамі
Сьцежку шукалі да ўласнай душы...
Чорныя хмары павісьлі над вамі, —
Дыхаць чым будзеце ў мёртвай цішы?

III.

КОЛАС, Вялікі наш КОЛАС!
Чуеш, як Нёман гудзе?
Чуеш?.. Знаём яго голас,
Думаю, добра Табе.

Тут Тваіх думак калыска,
Раніца песьняў Тваіх.
З даляў сягоньня няблізкіх
Тужыш, магутны, па іх.

Нёман нічым нястрыманы,
Вольны заўсёды, як быў,
Сёньня тугой ўсхваляваны
Грозна стары забруіў.

Б'юцца гарбатыя хвалі,
З ветрам шумяць лазьнякі,
Гоман плыве над палямі.
Гоман трывожны ракі.

Слухаюць вёскі і сёлы
Нёманаў гоман — тугі,
Восені сум невясёлы
Коўдрай накрыў берагі.

КОЛАС, Вялікі наш КОЛАС!
Чуеш, як Нёман гудзе?
Нёман з Табою гуторыць —
Шле прывітаньне Табе!

На пройдзеным шляху

(У 30-тыя ўгодкі творчае працы Якуба Коласа)

Дзесяць гадоў таму назад, калі ўся культурная Беларусь спраўляла дваццацілецьце паэтыцкае творчасьці Якуба Коласа, праф. Замоцін пачаў сваю стацьцю аб Коласе *) гэткімі словамі:

„Дваццацілецьце літаратурнае дзейнасьці — гэта ня звычайная юбілейная дата: гэта — мяжа, за якою для працаўніка пяра пачынаецца ці гістарычная вядомасьць, ці — гістарычнае забыцьцё".

Сёлета мы спраўляем новы Коласаўскі юбілей — трыццацілетні. І, дапаўняючы ўдатны афорызм праф. Замоціна, можам сказаць, што новы юбілей — гэта мяжа, з аднаго боку якое асталася большая частка жыцьця Коласа, з другога — невялікі ўжо астатак жыцьця, у каторым трудна спадзявацца нечага новага, нечаканага. Дык маем права разглядаць творчасьць Коласа блізу як закончаную: такіх глыбокіх зьмен у навакольным жыцьці, якія бачыў Колас, ды якія адбіліся на ягонай псыхіцы і творчасьці вельмі ярка, яму бадай што перажыць другі раз не давядзецца.

Гэта аблягчае задачу аглядчыка творчасьці Коласа, дае магчымасьць поўнага адтварэньня ягонага духовага аблічча — бяз рызыка, што напісанае аб паэце сягоньня можа аказацца няправільным заўтра — з прычыны зьмены гэтага аблічча. Мастацкая-ж веліч паэта, прызнаная згодна ўсімі крытыкамі ўжо дзесяць гадоў таму назад, напэўна за гэты час не паменшылася: Колас, ня спыняючыся, ідзе ўсьцяж наперад.

У творчасьці Коласа бачым два ідэолёгічныя пэрыяды. Першы — гэтак званы *„нацдэмаўскі"* ці нацыянальнаадраджэнскі, які абыймае час ад пачатку паэтыцкае працы юбіляра ажно да першых год БССР, другі — *„пралетарскі"*. Хоць у абодва пэрыяды Колас быў і астаўся тым-жа вялікім мастаком слова, творчасьць яго з ідэолёгічнага боку рэзка зьмянілася. І дзеля гэтага тэматыку і ідэолёгічны зьмест творчасьці нашага юбіляра з абодвух пэрыядаў трэба разглядаць асобна.

I.

Пэрыяд нацыянальна-адраджэнскі быў найбольш плодны. Гэта ён даў славу паэту; гэта на падставе апублікаваных у гэтым пэрыядзе мастацкіх твораў Коласа ўрад Савецкае Беларусі даў яму ў 1926 годзе пачэсны тытул „народнага паэты". У творах гэтага пэрыяду Колас, геніяльны артыста-маляр, намаляваў жывым мастацкім словам усё тое, чым жыў беларускі

*) Зборнік „Якуб Колас у літаратурнай крытыцы", Менск, 1926.

вясковы народ, беларуская народная інтэлігенцыя, урэшце — сам паэт, каторы, хоць ужо інтэлігент — народны настаўнік, астаўся верным сынам узгадаваўшае яго вёскі. Характэрнай рысай творчасьці Коласа было тое, што ён не даваў лішняе волі фантазіі, а маляваў запраўднае, зусім рэальнае беларускае жыцьцё, выліваў у сваіх лірычных вершах свае настроі і перажываньні зусім шчыра і беспасрэдна. Нават абразы прыроды — гэта адбітак тых мяйсцовасьцяў, дзе праводзіў паэт свае дзіцячыя дні. Нават дзеючыя асобы — і тыя сьпісаны з натуры. — Творчасьць Коласа гэтага пэрыяду прадстаўляе гэтак ня толькі вялікую мастацкую цэннасьць, але адначасна і нязвычайна важны жыцьцёвы дакумэнт.

Пачаў Колас з пісаньня лірычных вершаў, і на іх мы ў першы чарод мусім затрымацца: яны-ж найлепей знаёмяць нас з унутраным сьветам, з духовым аблічча паэта.

Звычайна прынята лірыку паэта разглядаць у сувязі з ягоным жыцьцём, якое яе тварыла. Аднак дзеля падрабязнага азнаямленьня з жыцьцём юбіляра мы адашлём чытача да зьмешчанае ў гэтым-жа нумары часапісу аўтобіографіі Коласа, напісанай ім у 1926 годзе, і пры разглядзе твораў Коласа будзем адзначаць толькі тыя мамэнты ягонага жыцьця, якія беспасрэдна вяжуцца з яго творчасьцяй.

Першыя лірычныя вершы свае пісаў Колас — парасейску. Няхай гэта ня пужае нашых „нацыянальных пурыстаў“: у той час, як гэта дзеялася, ня было йшчэ шырокага беларускага нацыянальнага руху, не існавала й беларускае грамадзянства, аб’яднанае нацыянальнай сьведамасьцяй, ды толькі адзінкі, часта нічога ня ведаўшыя адна аб аднэй, пробавалі нешта рабіць для беларускае справы — на ўласную руку. А Колас да таго-ж вучыўся граматы ў расейскай мове, пасьля хадзіў у расейскую народную школу (іншых ня было!), а ў канцы 90-ых гадоў мінулага стагодзьдзя пастурiў у расейскую-ж вучыцельскую сэмінарыю. Падчас навукі знаёміўся з расейскай паэзіяй і, узіраючыся на яе, у паэтыцкую форму ў чужой мове выліваў свае ўласныя пачуцьці, сваю любоў да роднае вёскі і да Зямлі Беларускае. Толькі пазьней — пад уплывам прыпадкова папаўшага яму ў рукі беларускага вершыка Янкі Лучыны „Стары лясьнік“ — пачаў Колас тварыць і ў беларускай мове, хутка зусім пакінуўшы пісаньне парасейску.

Што-ж было тэмай лірыкі Коласа? Што яго так узварушала, што пабуджала да тварэньня?

Перад усім — навакольнае жыцьцё, якое бачыў. Прырода, яе хараство — часам яркае, сонечнае, але пераважна — сумнае, агорненае дымкай тугі, як быццам адбіваючае сум і тугу народу-гарапашніка, што на роднай зямлі ад вякоў працуе ў голадзе й холадзе, зьдзеку й паняверцы, — вось найчасьцейшыя тэмы

лірыкі Коласа. Абразы, якія Колас малюе, гэткія жывыя, гэткія плястычныя, што папросту стаяць нам уваччу. А побач з прыродай — гора народнае, галіта беларускае вёскі ўзварушаюць паэта ад наймаладзейшых гадоў, праведзеных на вёсцы. Узварушаюць гэтак глыбака, што ў адным з першых вершаў, напісаных у беларускай мове падчас агульнага ўздыму народных мас усяе Расеі ў 1905 годзе, паэт з нязвычнай яму рэзкасьцяй зварачаецца да „багачоў і панства", пагражаючы за крыўды народныя — шыбеніцамі... („Ворагам"). Але гэткіх выбухаў у Коласа мала, і ён пераважна з болем у сэрцы малюе народнае жыцьцё— з усімі яго нягодамі, і глыбокім, шчырым спогадам сярмяжным братом веець ад кожнага радка Коласавых вершаў. Колас сваімі вершамі хоча „раскатурхаць" цемру й сон народны, разбудзіць нясьведамыя масы, каб павясьці па шляху вызваленьня. Найбольш яркім яго вершам на палітычна-грамадзкія тэмы трэба лічыць той, якім ён — ужо ў канцы першага пэрыяду сваей творчасьці — адгукнуўся на мір у Рызе ў 1921 г. („Беларускаму люду"). Імкненьне да волі народнае зьліваецца ў Коласа з яго ўласным імкненьнем да вызваленьня з-за кратаў падчас адбываньня трохгадовае вастрожнае кары — за ўчасьце ў барацьбе за беларускую школу. Тут — за кратамі — сум па ўтрачанай волі цяжка прыгнятае душу паэта. Тут родзяцца найхарашэйшыя лірыкі Коласа, зьмешчаныя ў зборніку вершаў „Песьні жальбы" (Вільня, 1910 г.), як: „Песьня няволі", „Гусі" і іншыя. Ня менш цяжка, чым вастрог, перажывае Колас тыя гады разлукі з родным краем, якія ён правёў на чужыне — у Маскоўскай, Пермскай і пасьля Курскай губэрні — ад 1915 да 1921 году. Ня пішацца там паэце, а калі й варочаецца да яго Муза ягоная, дык яна вельмі-ж сумная, маркотная. Уся лірыка Коласа глыбака прасякнена ўкаханьнем роднага краю і свайго народу, уся яна адпавядае тэй ідэолёгіі, якая была так характэрна для беларускіх адраджэнцаў „нашаніўскае" пары.

Шмат спрэчак было ў беларускай літаратурнай крытыцы на тэму аб пэсымізьме лірыкі Коласа. Ці Колас — запраўды пэсыміст? Інакш: ці ягоныя настроі прыгнятаюць, родзяць безнадзейнасьць, ці — наадварот — дапамагаюць прабуджэньню барацьбянае энэргіі дзеля перамаганьня жыцьцёвых нягод? — Крытыка „нашаніўцаў" ня лічыла Коласа пэсымістам: сум яго вынікаў заўсёды з пэўных об'ектыўных вонкавых прычын, а не з духовае істоты самога паэта. І вершы Коласа не прыгняталі чытачоў, а запраўды-ж вельмі дапамагалі нацыянальнаму і грамадзкаму прабуджэньню іх. Вершы Коласа ў тыя запраўды сумныя часы нязвычайна захоплівалі і маральна падыймалі чытачоў: яны казалі, што нам жывецца блага, але й паказвалі ўперадзе ясьнейшыя гарызонты:

Хоць вечна мы блукаемся,
а ўсё-ж такі, хоць некалі,
ды праўды дапытаемся!

А ў лірычным апісаньні падарожы цялежкай на бясконцых дарогах Беларусі („Думкі ў дарозе“) Колас, малюючы галіту беларускае вёскі, дае побач нязвычайна рэзкую антытэзу ёй у апісаньні панскага палацу, у выніку чаго дасягае такога эфэкту, якога іншыя песьняры не заўсёды могуць дасягнуць нават найбольш бунтарнымі словамі й заклікамі. Колас наагул будзіць нацыянальнае і грамадзкае пачуцьцё ня словамі, ня лёзунгамі, а паэтыцкімі абразамі, якія найлепш гавораць аб ягоным высокім мастацтве.

Характэрная рыса лірыкі Коласа — яго духовая раўнавага, якая нарушаецца толькі вельмі рэдка. А побач з раўнавагай, з гармоніяй духовай займае ў Коласа значнае мейсца спакойны гумар. Але і ў Коласа бываюць мамэнты, калі навакольнае жыцьцё ўсё-ж такі гэту раўнавагу нарушае. Гэтак было, напрыклад, калі ён пісаў успомненыя ўжо вершы свае „Ворагам“ і „Беларускаму люду“. У іншым кірунку адбываецца гэткае-ж нарушэньне духовае раўнавагі ў паэты ў той пераломны для Беларусі мамэнт, калі важыўся лёс новага ладу для яе, калі адзін за адным зьмяняліся тут усё новыя й новыя ўладары („Родныя малюнкі“ 1921 г.). І гэтаму прыроджанаму рэалісьце прадстаўляюцца на родных гонях нейкія зусім нерэальныя цені-страхі, якія будзяць нейкую беспрадметную трывогу, нейкую няпэўнасьць („Звон шыбаў“, „Цені-страхі“, 1921 г.). — Але такі настрой хутка мінае, і паэт ізноў глядзіць з верай у будучыню:

Куды ні гляне маё вока —
Ўсё поўна згоды, дабраты...
Ты маеш выгляды прарока,
Наш край пакуты, край сьвяты!

— кажа Колас у вершы „У палёх Беларусі“, які напісаў вярнуўшыся на Бацькаўшчыну пасьля многалетняга бадзяньня на чужыне (1921 г.).

Лірыка Коласа сабрана ў двух зборнічках вершаў: „Песьні жальбы“ (Вільня, 1910 г.) і „Водгульле“ (Менск, 1922 г.). Але памыліўся-б той, хто падумаў-бы, што ў гэтых зборнічках — уся лірычная творчасьць Коласа. Шмат лірыкі знойдзем мы йшчэ ў ягонай цудоўнай паэме „Сымон Музыка“ — у апошнім яе, закончаным і аканчальна апрацаваным выданьні (Менск, 1925 г.) *). На асаблівую ўвагу заслугуюць тут лірычныя ўстаўкі, у якіх паэт малюе свае ўласныя настроі, перажываныя з ускрашэньнем у памяці абразоў роднае прыроды ці даўно забытых уражаньняў, так глыбака ўзварушаючых і кожнага чытача (уступленьне і адрыўкі: „Гэй дарогі ў край шчасьлівы!“, „Гарэў агонь — пагас агонь“ і іншыя). З гэтымі лірычнымі ўстаўкамі неабходна пазнаёміцца кожнаму, хто хоча глыбей заглянуць у песьнярову душу, пазнаць крыніцы творчасьці Коласа.

*) Гэтае выданьне шмат розьніцца ад надрукаванага ў 1918 годзе ў пачаткавай постаці недаконченага йшчэ тады твору Коласа.

Ці-ж трэба дадаваць, што гэтыя вершы, напісаныя ў часе поўнае мастацкае дасьпеласьці паэта, хараством формы сваей зусім адпавядаюць хараству й багацьцю зьместу? Што мова тут—яшчэ больш дасканалая, што верш—яшчэ больш лёгкі й мілагучны? Гэта-ж рэч сама сабой зразумелая. І гэта-ж—доказ нясупыннага поступу ў разьвіцьці паэтыцкае творчасьці Коласа.

Калі ўжо ў лірыцы, дзе абраз служыць пераважна як-бы падставай, дапаможнікам дзеля выяўленьня пачуцьця паэта, мы можам адзначыць малярскія здольнасьці Коласа, дык гэтая асноўная рыса ягонае творчасьці йшчэ больш ярка выявіцца пры разглядзе эпосу Коласа: тут маляваньне ёсьць найбольш істотная частка зьместу.

Эпос Коласа (тут аўтар выступае пад іншай мянюшкай: як *Тарас Гушча*) складаецца з дробных апавяданьняў (у першым пэрыядзе — зборнічкі „Апавяданьні“, 1912 г., „Батрак“, „Прапаў чалавек“, „Тоўстае палена“, „Нёмнаў дар“, „Родныя зьявы“, 1914 г., „Казкі жыцьця“, 1921 г.), дзьвюх повесьцяў—„У палескай глушы“, 1923 г., і „Ў глыбі Палесься“, першых частак закончанае толькі ў апошнія гады трылёгіі, урэшце—дзьвюх вялікіх паэм—„Новая Зямля“ і „Сымон Музыка“ (1925 г.). Перш, чым падойдзем да разгляду іх, адзначым некаторыя мамэнты з жыцьця паэта, якія выясьняюць зьмест разгляданых твораў.

Як ведама, Колас — гэта сын вёскі. Бацька ягоны, малазямельны селянін, ня мог выжыць з сваей сям'ёй на сваей гаспадарцы і мусіў ісьці на службу да паноў — за лясьніка ў РадзіВіллаўскіх лясох. Там — у гэных лясох, на ўлоньні прыроды, праходзілі дзіцячыя гады Коласа; там душа яго гэтак шчыльна, гэтак неразрыўна зьвязалася з роднай прыродай. Там-жа малы Костусь *) першы раз, але не адзіны, сваімі дзіцячымі вачыма пабачыў той зьдзек, які быў прымушаны цярпець ягоны бацька, чалавек працы, ад сваіх паноў. Там-жа ў душы паэты „змагазынаваліся“ тыя абразы жыцьця беларускай сялянскай сям'і, якія Колас пасьля і намаляваў у сваіх мастацкіх творах.

Далей, скончыўшы вучыцельскую сэмінарыю, пайшоў Колас на самастойную працу, як школьны настаўнік. Жыў і працаваў у глухіх палескіх кутох. Добра пазнаёміўся з жыцьцём беларускіх дзяцей і калегаў-настаўнікаў у школе, а па-за школай — з тэй народнай „інтэлігенцыяй“, тым вясковым „панствам“, якое складаецца з дробных урадоўцаў, валаснае ўлады, вясковага духавенства і да т. п. І гэты пэрыяд жыцьця знайшоў шырокае адбіцьцё ў Коласавых творах, дык і яго нельга абмінуць моўчкі.

Калі Колас стаўся супрацоўнікам „Нашае Долі“ і пасьля наступніцы яе „Нашае Нівы“ (ад 1906 году), ён — побач з вер-

---

*) Сапраўднае імя і прозьвішча паэта — Кастусь Міцкевіч.

шамі — пачаў пасылаць туды і свае апавяданьні. Апавяданьні прадстаўлялі вельмі яркія абразкі з жыцьця беларускае вёскі. Гэта былі як-быццам актуальныя фотографіі, ілюстраваўшыя бягучы мамэнт на вёсцы. Пачалося з сьвежых яшчэ водгукаў рэвалюцыі 1905 году („Бунт“, „Соцыяліст“); далей пайшлі бытавыя апавяданьні з жыцьця сялян — з цікаўнай псыхолёгічнай асновай („Малады дубок“, „Кажух старога Анісіма“, „Недаступны“, „Дзяліцьба“, „Нёмнаў дар“ і інш.), такія-ж апавяданьні з жыцьця вясковага „панства“ („Пісаравы імяніны“, „З днеўніка пана Жылака“, „Так і трэба ашуканцу“). Тыпы Колася — заўсёды праўдзівыя, заўсёды жывыя, папросту сфатаграфаваныя з натуры. Аднэй-другой рыскай Колас знамяніта характэрызуе сваіх герояў, выяўляе іх істотнае аблічча. Паміж іншым, шмат мейсца ўдзяліў наш паэт беларускім дзецям („У старых дубох“, „Злучыліся“), асабліва-ж — тэй трагэдыі, якую пераж ывала беларускае дзіця, папаўшы да здэнацыяналізаванага места, дзе яго перараблялі на чужацкі капыл, выбівалі з яго беларушчыну—„дзеравеншчыну“ (апавяд. „Дзеравеншчына“). Урэшце, у апавяданьнях сваіх, наагул наскрось прасякнутых беларускім народным духам — з нярэдкімі ў Коласа гумарыстычнымі рыскамі, закранаў юбіляр наш і пытаньне нацыянальнае. Ужо ў „Дзеравеншчыне“ бачым падыход да гэтага пытаньня, толькі ў форме сьцьвярджэньня нацыянальнае крыўды, робленае беларусу. У алегорычнай казцы аб трох братох („Дудар“) Колас зварочваецца да двух старшых братоў беларуса, у якіх лёгка пазнаць украінца ды расейца, заклікаючы іх, каб ня толькі прызналі прыроднае права меншага брата падаць свой голас — у роднай мове — на ўвесь сьвет, але каб і дапамаглі яму дагнаць апярэдзіўшых яго ў культурным разьвіцьці старшых братоў. Гэтае апавяданьне асабліва характэрнае для Коласа: тут адбіўся ўвесь сьветапагляд паэта — яго глыбокі гуманітарызм, пашана да правоў чалавека, жаданьне нацыянальнае згоды і брацтва народаў. З гэтага шляху Колас ня зыходзіў усё сваё жыцьцё. За гэта меў і мае вялікую пашану ўсяго нацыянальна сьведамага беларускага грамадзянства — па сягоньняшні дзень.

Асаблівае мейсца займаюць у Коласа алегорычныя апавяданьні — „Казкі жыцьця“, у якіх дзеюць жывёлы, расьціны і сілы прыроды, але заўсёды ў іх крыецца глыбокая філёзофская ці грамадзкая думка, якую лёгка датарнаваць да жыцьця людзей.

Дзьве повесьці Коласа — „У палескай глушы“ і „У глыбі Палесься“ — гэта бадай-што аўтобіографія аўтара, якая абыймае першыя гады яго настаўніцкае працы на Палесьсі — з усімі сьвежымі, ідэальнымі парываньнямі моладасьці, чыстымі, сьветлымі імкненьнямі да грамадзкае працы на карысьць народу. Ідэальная постаць Лабановіча рэзка выдзяляецца на фоне агульнае бязыдэйнасьці вясковае „інтэлігенцыі“ — абмаскоўленых настаўнікаў - чыноўнікаў, духавенства вясковага, валасных пісароў, дробных урадоўцаў, дзяўчат з гэтае сфэры і г. д. Калі прыгле-

дзімся да дзеючых у повесьцях асоб, дык лёгка пераканаемся, што Колас надзяліў іх тымі-ж псыхолёгічнымі рысамі, якія мы ўжо бачылі ў герояў дробных апавяданьняў, — толькі-ж у повесьцях яны прадстаўлены больш поўна, усебакова, на фоне таго асяродзьдзя, у якім жывуць і дзеюць. Лёгка мог-бы малады настаўнік-ідэаліст, закінены ў глухі куток Беларусі і адарваны ад культурнага жыцьця, паддацца пануючым сярод вясковае „інтэлігенцыі" настроям, забыцца аб сваіх ідэалах і загразнуць у дрыгве — сярод п'янства, гульні ў карты, даволі грубага „флірту" з паненкамі. Але герой Коласа, інакш — сам аўтар, выйшаў з усіх жыцьцёвых спробаў пераможцам. Канец другое часткі трылёгіі („У глыбі Палесься"), гэткі падобны вонкава да разьвязкі ў апавяданьні „Бунт", найлепш сьведчыць аб гэтым. Даючы гэткую рэзкую антытэзу героя і асяродзьдзя, як і ў „Думках у дарозе", паэт выкарыстывае яе дзеля прабуджэньня ў чытачоў абурэньня на гэнае асяродзьдзе, здаровага грамадзкага і нацыянальнага пачуцьця, пачуцьця абавязку працы для свайго забітага, пакрыўджанага народу.

Повесьці Коласа напісаны гэтак сама жыва, сакавіта, як і ягоныя апавяданьні. Пасталеўшы, прайшоўшы доўгі ўжо шлях жыцьця, юбіляр не абмежываецца дробнымі мамэнтамі з беларускага жыцьця, а стараецца даць шырокі, поўны, усебаковы абраз гэтага жыцьця. Гэтым імкненьнем, здаецца, можна растлумачыць і нарадзіны двух вялікіх эпіцкіх твораў, аканчальна замацаваўшых славу Коласа, як корыфэя беларускае паэзіі, — паіменна: „Новае Зямлі" і „Сымона Музыкі".

Літаратурная крытыка раўнуе „Новую Зямлю" з польскай паэмай „Pan Tadeusz" Адама Міцкевіча і расейскай — „Евгеній Онегін" Пушкіна. Параўнаньне гэтае трэба прымаць аднак з паважнай засьцярогай: у істоце сваей яны — непараўнальныя, бо лішне вялікі пэрыяд ад часу іх дзеліць, лішне розны ў іх зьмест і характар, ідэі і заданьні, урэшце — мастацкія прыёмы зусім індывідуальныя ў усіх трох паэтаў. Можна затое сказаць, што Коласава паэма сваей мастацкай вышынёй раўнацэнна, калі ня вышэй за тыя дзьве, што яна ў нашыя часы і ў нашым асяродзьдзі адыграла ня меншую ролю, чым польская і расейская — у часох іх напісаньня — у польскім ды расейскім жыцьці. Калі-ж будзем шукаць бліжэйшых аналёгіяў у нашай сучаснасьці, дык паэма Коласа адпавядае ў польскай літаратуры хіба толькі повесьці Рэймонта „Chłopi", адзначаная, як цэннасьць агульналюдзкая, прэміяй Нобэля, у расейскай-жа літаратуры адпаведніка ей, здаецца, ня знойдзем.

„Новая Зямля" дае самы поўны, самы ўсебаковы абраз жыцьця малазямельнае сялянскае сям'і, прымушанае галадаваньнем на ўласнай жабрацкай гаспадарцы пакінуць апошнюю і йсьці на службу да паноў. І хоць аўтар і ў гэтым творы дае шмат аўтобіографічнага матарыялу, апісуючы сям'ю свайго бацькі ды ўласнае жыцьцё ў ей, дадзены Коласам абраз ёсьць т ы п о в ы

для ўсяго беларускага незаможнага сялянства. Падзеі ў сям'і лясьніка Міхала, бацькі паэта, разьвіваюцца на асноведзі, якую прадстаўляе праведзеная тут аўтарам ідэя. Гэтая ідэя, цяпер выклінаная ў БССР урадавымі чыньнікамі і пакорнымі апошнім пісьменьнікамі, — ідэя, якое выракся (з добрай волі, ці не, — над гэтым затрымліваццa ня будзем!) і сам Колас, — ёсьць адвечная цяга селяніна да зямлі, на якой ён толькі і можа чуць сябе вольным і моцным, быццам той старагрэцкі Антэй, — да таго-ж цяга да ўласнае зямлі. І з гэтага гледзішча „Новую Зямлю“ мы маем права назваць эпопэяй беларускага сялянства, у пэўнай меры нават — беларускага народу, бо іменна гэты народ ёсьць галоўная дзеючая асоба твору Коласа, хоць і ўвасоблены ў аднэй тыповай сям'і.

Дзеля таго, што галоўная ідэя „Новае Зямлі“, як нязгодная з марксызмам, які запанаваў на Усходзе, ня мае там права грамадзянства, — гожа затрымацца на генэзісе гэтае ідэі. Бясспрэчна, што псыхіка беларускага селяніна, хаця-б гэта быў нават беззямельнік, ёсьць псыхіка ўласьніцкая; але вырасла яна з тых соцыяльных абставінаў, у якіх жыў, а ў нас, на Захадзе, і цяперака жыве гэны селянін. — Вось той шлях, які, паводле „Новае Зямлі“, давёў Міхала да думкі аб неабходнасьці здабыць сабе кусок зямлі на ўласнасьць і стацца незалежным ад паноў.

Паны і іхнія давераныя людзі ня бачылі ў лясьніку чалавека. Лаянка, зьнявага, а то й кулачная расправа — „мардабойства“ — былі штодзенным хлебам лясьнікоў у Радзівіллаўскіх лясох. Міхал аб гэтым вось як кажа:

Але-б вы самі спрабавалі,
Калі-б у вочы вам плявалі
І вас агіднаю зьнявагай
Па сэрцу білі, як тэй шлягай!
А ты маўчы, сьвяці вачамі
Перад паўпанкамі, панкамі
І перад панскім розным збродам,
Цярпеньнем скованы, як лёдам.

Паміма гэтага — варункі працы страшэнна цяжкія і з іншага гледзішча. Міхал дастаў лясьніковую пасаду ў адным мейсцы, папрацаваў там некалькі гадоў, давёў гаспадарку да парадку, улажыўшы працу ўсей сваей сям'і, і ўжо цешыўся, што будзе мець заслужаныя вынікі зробленага высілку. Ды дзе там! Лясьнічы трымаўся такое сыстэмы, што не даваў лясьнікам заседжвацца доўга на адным мейсцы: баяўся, каб ня зжыліся, не ссябраваліся з акалічным сялянствам — на шкоду паном... І вось гэткі-ж лёс спаткаў і Міхала: яго ўсьцяж перакідалі з мейсца на мейсца, уся праца яго на гаспадарцы — на чужой зямлі! — марнавалася, і ён увесь час чуў сябе няпэўным, нічым незабясьпечаным. Гэта страшэнна мучыла Міхала. Ён пачуваў

сябе цяжка пакрыўджаным, ня бачыў ніякага спосабу змагацца з гэтай крыўдай і шукаў выхаду з утварыўшагася палажэньня толькі ў адным кірунку:

А дзе-ж той выхад, дзе збавеньне
З няволі цяжкай, з паланеньня?
Адзін ён ёсьць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ральля!
То наймацнейшая аснова
І жыцьця першая умова.
Зямля ня зьменіць і ня здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасьць волі, дасьць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх ня кіне,
Зямля — аснова ўсей айчыне!

Каротка кажучы, свая зямля — гэта ў вачох беларускага сялянства з апісаных Коласам часоў (а ў заходне-беларускіх землях — і з цяперашніх!) ёсьць адзіны шлях да вызваленьня, да праўдзівае волі. Дык да гэтага-ж і зводзіцца ідэолёгічны зьмест Коласавае паэмы.

Ня будзем тут шырэй затрымлівацца над высока мастацкімі апісаньнямі прыроды і яе хараства ў паэме „Новая Зямля". Тут Колас выявіў сябе, як запраўдны маляр прыроды. Беларускія краявіды, усходы й за́хады сонца, работы ў полі — жніво й сенакос — усё гэта адбілася ў „Новай Зямлі" у непараўнальных сваей красой абразох. Колас падняўся тут на недасяжную для другіх пісьменьнікаў вышыню. Даводзіць, што гэта запраўды так ёсьць, значыць даводзіць рэч зусім ясную. І мы замест гэтага адашлём чытача да арыгіналу Коласа. Самі-ж вернемся да ідэолёгіі Коласа, выяўленай у ягоных паэмах. Бо-ж і „Сымон Музыка" ў сваей істоце — такі-ж цудоўны, натхнёны гымн волі. Толькі тут Колас ужо ня толькі маляр: ён адначасна і музыка, бо-ж знамяніта ўмее перакладаць на словы — музыку, бо гэтая ягоная паэма ўся наскрось прасякнута музыкай: усё ў ёй сьпявае!

Паэма „Сымон Музыка" пасьвячана беларускаму дзіцяці, якому і ў „Новай Зямлі" ўдзяліў паэт шмат мейсца. Пераходзячы да разгляду гэтае другое паэмы Коласа, нельга моўчкі абыйсьці запраўды-ж высока-мастацкага ўступу да яе — пасьвячэньня аўтарам твору свайго беларускай моладзі. Пасьвячэньне, паміма сваей цудоўнай формы, мае глыбокі зьмест: яно паказуе крыніцу творчасьці Коласа, які ў душы сваей зьбірае адбіткі запраўднага жыцьця і пасьляператварае іх у паэтыцкай форме. І добра зрабіў паэт, што свой твор прынёс, як дар, беларускай моладзі: герой паэмы, сялянскі хлопчык-артыста, прабівае сабе жыцьцёвы шлях ня з ласкі „можных гэтага сьвету", не дзякуючы апецы магната, які хутка перастаў цікавіцца сваей „забаўкай"-мастаком-самародкам, — а дзякуючы сваей ула-

снай духовай моцы, дзякуючы неразрыўнай сувязі сваей з сваім народам, служыць якому песьняй-музыкай — мэта жыцьця Сымонкі. У гэтым — добрая навука для тых чысьленых Сымонкаў беларускіх, што гэтак часта — за панскую ласку — адступаюцца ад свайго народу, выракаюцца сваей беларускасьці і, купіўшы гэткай цаной жыцьцёвую кар'еру, прыносяць славу чужынцам...

„Сымон Музыка“ — гэта гісторыя вызваленьня мастака-самародка, а наўперад — грамадзкага й нацыянальнага самаўсьведамленьня яго. Ад пачатку жыцьцёвае вандроўкі Сымонкі, калі бацька выгнаў яго з хаты, ён у цяжкіх варунках, крыўджаны і эксплёатаваны, падыймаецца духова ўсё вышэй і вышэй, дасьпявае і як грамадзянін, і як мастак. Вялікую ролю ў гэтым вырастаньні Сымонкі адыгрывае пачуцьцё нясьвецамае любові да Ганны, каторае ў канцы расьцьвітае, як цудоўная краска, і злучае гэтых двое маладых — дзеля далейшае супольнае жыцьцёвае вандроўкі. Але прыпадковае спатканьне Сымонкі з князем, каторы зацікавіўся хлапчуком-артыстам і ўзяў яго ў свой замак, стаўляе нашага героя перад спакусай пераходу на бок паноў і забыцьця аб сваім народзе. Ды Сымонка гэтай спакусе не паддаўся. Ня стаўся панскім служкай-лякаём, захаваў свой чалавечы воблік, сваю ўласную волю. Не задумываючыся, кінуў свайму апякуну-магнату праўду ў вочы, напомніў аб крыўдах сярмяжных братоў сваіх, пагразіў помстай народу... І гэта быў пераломны мамэнт у адносінах да яго князя: магнат зразумеў, што гэты асаблівы народны трыбун, узброены мастацтвам, можа запраўды стацца грозным і небясьпечным для паноў, — і вось ён адварачаецца ад Сымонкі, пакінуўшы сваю пачатковую думку даць хлапцу музыкальную адукацыю. Сымонка аказаўся мо' страчаным для „вялікага сьвету“, але захаваў свае сілы і здольнасьці, якім ня суджана было нармальна разьвіцца да канца, толькі для свайго народу — для сваіх сярмяжных братоў, каторыя так мала радасьці і красы маюць у сваім гаротным жыцьці.

Ці-ж трэба пасьля гэтага даказываць існаваньне ў Коласа нацыянальнае ідэолёгіі? Ці трэба шукаць зусім лішніх тут палітычных формулаў і лёзунгаў? Не: зьмест твораў Коласа сам гаворыць аб ягонай ідэолёгіі і паслужыў у сваім часе падставай для савецкіх дзейнікаў дзеля абвінавачаньня паэта ў „нацдэмаўшчыне“.

Каб закончыць агляд творчасьці Коласа ў першы пэрыяд яго літаратурнае працы, трэба было-б адзначыць яго драматычную творчасьць. Апошняя аднак даволі бедная: да вайны выйшла ў сьвет даволі слабая па сваей драматычнай фактуры п'еска „Антось Лата“; у першыя пасьля вайны гады — „Забастоўшчыкі“, удраматызаванае апавяданьне аб першым выступленьні беларускага вучыцельства на змаганьне за беларускую школу (патайны зьезд настаўнікаў у 1906 годзе). І толькі ў пачатку новага пэрыяду творчасьці Коласа выходзіць рад но-

вых драм яго, якія трэба разглядаць у сувязі з усей творчасьцяй Коласа гэтага пэрыяду. Нажаль, творы гэтага новага пэрыяду да нас, у заходне-беларускія землі, блізу не даходзяць, і матарыялу дзеля разгляду мы маем вельмі мала.

II.

Падходзім тут да другога — новага або „пралетарскага“ пэрыяду творчасьці Коласа. Пачнём, як і пры разглядзе першага пэрыяду, ад лірыкі паэта.

Неабходна, аднак, зрабіць агаворку: да нас наагул творы Коласа блізу не даходзяць. Дык прыходзіцца ў значнай меры абаперціся на тых аглядах творчасьці Коласа навейшага пэрыяду, якія зьмяшчаюцца ў савецкай беларускай прэсе.

Колас не адразу здолеў наламацца да новых вымаганьняў „савецкае грамадзкасьці“. Ужо ў дваццатыя ўгодкі паэтыцкай творчасьці яго літаратурная крытыка ў БССР рабіла паэце закід, што „ідэі кастрычніка з першых дзён існаваньня савецкае ўлады альбо зусім не адбіваліся ў творчасьці Коласа, альбо неналежным чынам адбіліся“. Так пісаў Шукевіч-Трацьцякоў у ўгодкавым выданьні „Якуб Колас у літаратурнай крытыцы“ (Менск, 1926 г.). Крытык пералічае доказы таго, што Колас доўга ня мог пайсьці з сучасным савецкім жыцьцём і адтвараў у сваіх творах мінулае. Але пад націскам крытыкі паэт „патроху пачаў вылазіць з „Палескае глушы“, настрой сучаснага ўносіць у сваю „Новую Зямлю“, ...перапрацаваў свайго „Сымона Музыку“, зьмяніў яго канец, рашуча sькінуў з Сымона ранеў аблытаўшую яго рэлігійную павуціну“. І хоць той-жа крытык урэшце сьцьвярджае, што ў найнавейшых сваіх творах Колас „раз назаўсёды парваў“ з „гнілым балотам“ мінулага, што ён выйшаў „на прасторы жыцьця савецкае краіны“, — усё-ж такі ён прызнае, што „Коласа мала цікавіць джаз-бандаўскі рытм гораду і наўрад ці калі адаб'е ён магутную дынаміку фабрыкі, заводу ў сваіх творах“. — „Затое — родная „лявоніха“, „мяцеліца“, беларуская песьня знойдзе добрае „водгульле“ ў яго творах. Затое — яго матка ў нядзелю так смачна падсмажвае аладкі, што жывот сам пачынае прасіць верашчакі. Затое — ён адбіў жыцьцё селяніна ад нараджэньня да сьмерці ня горш, чым Шылер у „Ліцьцё звону“, Пушкін у „Евгеній Онегін“, чым „Калевала“, „Одысэя“ — сучасныя ім эпохі“. Бо-ж Колас як быў, так і астаўся верным сынам і песьняром вёскі, хай сабе савецкай, але вечна жывой у працы на ральлі.

Названы крытык меў рацыю ў тым, што не прадстаўляў сабе, каб Колас пачаў адбіваць жыцьцё места. Колас запраўды і ў найнавейшых сваіх творах, асабліва лірычных, пяе аб ся-

лянскім жыцьці — ведама, — новым. На старую вёску ён глядзіць з пагардай. Вось што ён гаворыць у вершы „Старой вёсцы“ (1930 г.):

Убогая, старая вёска!
Ты ў рызманох, ты ўся ў саломе,
Пануе цемра ў тваім доме,
А ты стаіш на пераломе,
Шкадуеш выцьвіўшай палоскі!
Зірні наперад зоркім вокам
У наша сёньняшняе раньне...
Вітай дня новага сьвітаньне,
Ідзі машынам на спатканьне,
Ды грамадою, цьвёрдым крокам!
„Мая зямля”, „мой поплаў”,
„Мой луг”, „мой конь”, „мае каровы”,
Зьлінялыя, старыя словы,
Пара, пара даць сэнс ім новы,
Зьмяніць іх час на „наш” і „наша”!

Ад сваіх старых хутарскіх ідэалаў Колас адракаецца (цыкль вершаў „Калгаснае“ — 1930 г.), лічыць, што даўней вёскай „валодала зямля“, а цяпер — наадварот: цяпер „калгасы“ вывелі сялянства з гэнага „палону“. У вершы „Моладзь“, напісаным аднначасна з цытаванымі, паэт вітае вясковы маладняк, каторы (цытуем словы праф. Замоціна) „разам з бядняцкай масткай вёскі цалком гатовы пераключыць сваю энэргію на будаўніцтва новага ладу жыцьця“:

Прэч, саломенныя стрэхі,
Цесны двор і катухі!
Мы другія ставім вехі...
. . . .
. . . .
Трактар будзе наша зброя,
Сіла — моладасьць, парыў.
На работу сыпнем роем,
Сьвет нанова перакроім, —
Дык жыві-ж ты, калектыў!

І аб старых абразох, гэткіх родных і мілых некалі нашаму паэце, нічога ў памяці ў яго не асталося... Колас ужо пагадзіўся з новай сучаснасьцяй і ей пяе свае гымны:

Змоўкнуў звон хаўтурны
На старых капліцах,
Забурлілі бурна
Новыя крыніцы.
Загулі заводы,
Трактары ў калгасах...

Колас выразна процiўстаўляе мінулае сучаснаму Захаду, ясна — не на карысьць апошняму:

У нябыт адыходзіць зякляцьце вякоў
Гэты зьдзек,
Гэты жах кабалы...

Я вітаю вялікі, шырокі разгон
Нашых дзён маладых,
Гоман творчасьці іх...
Дык ярчэй-жа гары, сонца радасных дзён!

Як сьцьвярджае праф. Замоцін, із стацьці якога аб найнавейшай лірыцы Колася („Літаратура і Мастацтва“) мы ўзялі паданыя адрыўкі вершаў, паэт ўзьвялічае здабычы „Кастрычніка“, піша вершы папросту агітацыйнага характару і неаднакротна адракаецца ад сваей колішняй „наццэмаўшчыны“. Выступае ён і ў дні вялікіх урачыстасьцяў, як дапрыкладу ў дзень маёвага сьвята; пачатак вершу „Ў майскія дні“ тут падаем (ён вельмі характэрны для сяньняшняга Коласа):

Пеў я песьні колісь
У журботным тоне
Бяз пустых прыкрас,
Бо ня меў я волі,
Бо быў я ў палоне,
Бо такі быў час.
Ліха тое сёньня
Адыйшло далёка,
Зарасло быльлём.
Цёмнае прадоньне,
Дзе адчай галёкаў,
Зьнішчана суздром.

Ужо з паданых адрыўкаў лірычных вершаў Коласа бачым, што з боку тэхнікі так сама ёсьць у яго шмат новага. Адзначае гэта і праф. Замоцін у цытаванай стацьці („Лірыка Якуба Коласа 1930—35 гадоў“):

„Як лірычныя жанры, так і лірычныя вобразы, і стылістыка, і вершаскладаньне — усё ў лірыцы Коласа 1930—35 гг. ўступае ў фазу пэўнага аднаўленьня“. Няма суму. „Поўныя энтузьязму і патэтыкі рэвалюцыйныя гымны“. — „Вострая сатыра проці ворагаў дыктатуры пролетарыяту“.

„Лірычныя вобразы, праз якія аўтар дае нам сваё ідэолёгічнае праламленьне дадзенай тэмы, заўсёды канкрэтныя, жыцьцёвыя і носяць на сабе сьляды шырокага і праўдзівага ахопу паэтам сучаснага жыцьця ў яго асноўных задачах. Паэтычная стылістыка і вершаскладаньне ў лірыцы Коласа апошніх гадоў таксама актывізованы: у вершах адчуваецца жывая лексіка нашай эпохі, лексіка рэвалюцыйнага дзеяньня і вялікіх заваёў будуючагася соцыялізму. Аўтар карыстаецца больш актуальнымі па тонусу рытмамі (пераважна хорэічнымі і ямбічнымі), больш гнуткай і рознастайнай строфікай. Наагул, у лірыцы Коласа мы ўжо назіраем той шчасьлівы падыход да аўладаньня мэтадамі соцыялістычнага рэялізму, які больш канкрэтна выявіўся ў яго мастацкай прозе апошніх гадоў“.

Зразумелая рэч: Колас, як быў, так і астаўся вялікім мастаком слова.

Пяройдзем цяпер да мастацкае прозы Коласа. Яна і далей складаецца з апавяданьняў і повесьці.

Выданы ў Менску, у 1926 годзе зборнік апавяданьняў пад назовам „На прасторах жыцьця“ зьмяшчае рад большых і меншых апавяданьняў з савецкага ўжо жыцьця. Але тут адчуваецца яшчэ той — так добра нам знаёмы — стары Колас, які мае свой уласны пагляд на справы, які ўмее знайсьці і сьмяхотныя рыскі ў новым ладзе дый ахвотна з іх падкпіць. Да такіх апавяданьняў належыць невялічкі расказік „Хаім Рыпс“, дзе вельмі-ж гумарыстычна прадстаўлены нсвасьпечаныя савецкія ўлады на вёсцы. Але гэты зборнічак належыць яшчэ фактычна да старога пэрыяду творчасьці Коласа. З таго часу выйшла шмат новых рэчаў, якіх, нажаль, мы тут не атрымліваем... Да вялікшых апавяданьняў належыць Коласавы „Адшчапенец“.

„Адшчапенец“, паводле слоў самога Коласа, быў задуманы вельмі шырака. Галоўны герой — гэта селянін „старое даты“, заўзяты індывідуаліст, які вельмі варожа адносіцца да савецкае рэвалюцыі ў вясковым жыцьці. Колас маніўся правясьці яго даўгім шляхам назіраньня новага савецкага будаўніцтва, пазнаёміць з разбудовай мястовае прамысловасьці, паказаць усе дасягненьні Саветаў у розных галінах жыцьця і, пераканаўшы ў правільнасьці савецкай лініі, вярнуць у родны кут, як „навернанага“ на новую веру „калгасьніка“. Аднак, Коласу не ўдалося выпаўніць задуманы плян: падганяны савецкай крытыкай, каб хутчэй сваей творчасьцяй ішоў служыць калгаснаму будаўніцтву, Колас, як сам кажа, лішне пасьпяшыў і сваей працай нездаволены.

Такія-ж мэты праводзяць і другія найнавейшыя апавяданьні Коласа. Ня маем магчымасьці пазнаёміцца з іх мастацкай вартасьцяй беспасрэдна, але здаецца, што Коласавы прысуд над сабой — хіба-ж мае рэальныя падставы.

За тое Колас паказаў сябе ізноў вялікім мастаком у новай повесьці пад назовам „Дрыгва“ (Менск, 1934 г.), у якой некаторыя бачаць трэцюю частку трылёгіі Коласа. Аўтар нідзе гэтага сам не адзначае. Дый з першымі дзьвюмя часткамі трылёгіі „Дрыгва“ мае супольнае толькі адно: мейсца дзеяньня — Палесьсе. З старых дзеючых асоб мы нікога тут не спатыкаем. Рэч дзеецца падчас змаганьня з заняўшымі ў сваім часе Палесьсе польскімі легіонамі.

У аднэй стацьці ў часапісе „Літаратура і Мастацтва“ знаходзім гэткія радкі аб гэтай повесьці, зьместу якое дзеля зразумелых прычын мы пераказаць ня маем магчымасьці. — „Палеская пушча ізноў стала тэмай для Коласа, але зусім у іншым сэнсе і ў іншай абстаноўцы. Гэта ня тая „самабытная“ пушча, ад балот якое „патыхала нейкім нявыразным смуткам“ (так пісаў Колас у творы „У палескай глушы“). Палеская пушча, глуш у аповесьці „Дрыгва“ ператварылася ў арэну змаганьня, дзе „славутныя паляшукі“ вялі клясавую барацьбу, аддавалі сваё жыцьцё, абараняючы соцыялістычную радзіму ад нападу... інтэрвэнтаў“.—

Але тыя абразы, якія малюе Колас, маюць высокую мастацкую вартасьць: яны — бясспрэчна шчыра, з перакананьнем выліваюцца спад пяра Коласа. І таму повесьць мае вялікую мастацкую вартасьць, выведзеныя ў ёй тыпы — жывыя, сакавітыя, акцыя разьвіваецца вельмі жыва. Кніжка запраўды можа захапіць чытача.

У часапісе „Літаратура і Мастацтва“ знаходзім кароценькую зацемку аб тым, што ў сувязі з праектаваным у 1937 годзе вялікім сьвяткаваньнем 20-лецьця існаваньня савецкае ўлады ўжо загадзя падгатаўляюцца п'есы дзеля пастаноўкі падчас сьвяткаваньня. Здаецца, што дзеля гэтага апрацоўвае і Колас сваю — праўда, даўно задуманую, але дагэтуль недаканчаную, — драму „Вайна вайне“. З адрыўкаў, якія друкаваліся ў савецкай прэсе, трудна мець прадстаўленьне, што гэта будзе з боку мастацкага. Тэма-ж — ясная: паэт хоча прадставіць той масавы, усенародны рух проці далейшае вайны, якую — пасьля зваленьня царскае ўлады — хацеў вясьці ўрад Керанскага „да пабеднага канца“. Гэты рух выкарыстываюць бальшавікі, захопліваюць кіраўніцтва масамі і ўрэшце здабываюць у свае рукі ўладу. Што будзе ў п'есе беларускага — апрача мовы і дзеючых асобаў, — з апублікаваных адрыўкаў вывесьці цяжка. Здаецца, аднак, што „Вайна вайне“ будзе належаць да тых твораў, якія аднолькава выходзяць на ўсіх мовах і на ўсіх сцэнах.

Вось усё тое, у чым выявілася новае аблічча Коласа.

У найнавейшым пэрыядзе паэтыцкае творчасьці Коласа заслугоўвае так жа на ўвагу яго творчасьць для дзяцей. Тут Колас робіцца роўна блізкім і зразумелым для кожнага беларуса, для кожнага чалавека, асабліва-ж — для кожнага пэдагога, незалежна ад ягоных палітычных і сацыяльных паглядаў.

Ведама, і ў вершах, пасьвячоных дзецям, выяўляюцца новыя настроі Коласа.

Для дзяцей Колас напісаў — судзячы паводле савецкае крытыкі — запраўды-ж цэнны эпіцкі твор, які хіба-ж адпавядае таму дару моладзі беларускай, што даў ей Колас у „Сымоне Музыцы“. Гэта ёсьць „Міхасёвы прыгоды“ (1935 г.). Мы не маглі атрымаць гэтае паэмы, каб беспасярэдне з ёю пазнаёміцца. Але тое, што піша аб ёй С. Куніцкі ў № 58 „Літаратура і Мастацтва“ з 18. X. 1936 году, прымушае думаць, што нашая дагадка — правільная. Дык падаём сказаную рэцэнзію савецкага крытыка ў скарочаньні.

„Паэма „Міхасёвы прыгоды“ (1935 г.) мае выключную цікавасьць. Яна наскрозь пранікнута оптымізмам, радасьцю, напісана з вялікім майстэрствам. Яна яшчэ і яшчэ раз

сьведчыць аб выключным веданьні паэтам сваеасаблівасьцей дзіцячых успрыняцьцяў, дзіцячай псыхікі. На працягу ўсяе паэмы мысьль і фантазія чытача актывізуюцца, перад маленькім чытачом раскрываюцца шырокія краявіды рознастайных малюнкаў прыроды, чытач на кожным кроку сустракае жывыя вобразы жыцьця.

З самых першых старонак паэмы маленькі чытач пападае на „луг квяцісты“, перад яго вачыма „прыгожая рэчка“, „расступіўся лес ва ўсе бакі“, а „там шумела морам жыта, а ячмень густы, зялёны адбіваў усім паклоны". Ён адчувае цяпло сонца, подых ветру, пах розных кветак. Тут-жа маленькі чытач сустракаецца з рознымі птушкамі, буслямі, рыбамі, вожыкамі, гадзюкай, воўкам. Перад яго вачыма — суніцы, розныя грыбы і іншае. Усё гэта апісана ўмелай рукой мастака. Усё гэта прыкоўвае ўвагу чытача.

Усё багацьце зьяў і прыроды ў паэме композыцыйна зьвязана з асноўным героем паэмы—Міхасём. Міхась стаіць у цэнтры паэмы, а навакол яго — зьвязаная з ім прырода, сьвет расьцін і жывёл. Гэта робіць паэму асабліва дзейнай, бо адносіны Міхася да навакольных зьяў завастраюць увагу чытача, актывізуюць яго ўспрыйманьні.

Дзеяньні і прыгоды хлопчыка Міхася, якія разгортваюцца ў паэме, зьяўляюцца цалкам тыповымі і характэрнымі для яго ўзросту (9—10 гадоў). Ён усё імкнецца пазнаць, усё яго цікавіць і вабіць Ён актыўна ўключаецца ў кожную зьяву, увесь час дзейнічае, напоўнены рознымі, уласьцівымі яго ўзросту клапотамі.

Бадзёрасьць Міхася, яго жыцьцярадаснасьць на працягу ўсяго твору гармонічна зьліваюцца з радаснай, поўнай жыцьця прыродай, з радасьцю калгасных палёў, дзе „шуміць морам жыта“, дзе „ячмень густы, зялёны адбівае ўсім паклоны“.

Шырока пазнаёміўшы свайго маленькага чытача з багацьцем жывой прыроды, аўтар у апошняй частцы твору пераключае яго ўвагу на горад. Гэта пераключэньне ставіць тую-ж мэту, што і пры паказе прыроды: пазнаёміць маленькага чытача з асаблівасьцямі гораду, у прыватнасьці з жыцьцём гарадзкіх дзяцей. Гэта аўтар ажыцьцяўляе ізноў-такі праз вобраз свайго асноўнога героя паэмы, Міхася.

У гутарцы з калгаснымі дзяцьмі Міхась расказвае пра асаблівасьці гораду, пра трамвай, аўтамабілі, танкі, танкеткі, пра самалёты, пра гарадзкія сьвяткаваньні і інш. Тут-жа Міхась расказвае і пра радаснае жыцьцё дзяцей гораду ў дзіцячых садох.

Паэма „Міхасёвы прыгоды“ вызначаецца вялікай мастацкай і дзейнай сілай. У ёй кожны вобраз, кожнае слова напоўнены глыбокім сэнсам, праўдай жыцьця, і ў той-жа час

паэма вызначаецца мастацкай прастатой. Мова і вобразы паэмы сваімі карэньнямі ўваходзяць у багатую народную мову".

Ці-ж хаця-бы на падставе гэтага водзыву мы не пазнаем у аўтары старога нашага знаёмага — аўтара „Сымона Музыкі"?..

Шмат для каго асоба Коласа прадстаўляе псыхолёгічную загадку. Як ён мог так лёгка прытарнавацца да сучаснага савецкага соцыяльнага жыцьця — як-быццам бяз глыбейшае ўнутранае барацьбы і ломкі?

Душа чалавека — процьма: трудна ў ёй разьбірацца. Магчыма, што Коласа запраўды гэтак глыбака захапіла новае жыцьцё ў Савецкай Беларусі, што яго оптымізм, радаснасьць, патос — шчырыя. Магчыма.

Але ёсьць і другі мамэнт, які мусіў адыграць ролю ў „навярненьні" Коласа на „новую веру". Колас заўсёды быў **маляром** жыцьця і ў гэтым адрозьніваўся ад Купалы, які хацеў быць тварцом-рэфарматарам гэтага жыцьця. Колас заўсёды маляваў тое, што ёсьць, незалежна ад таго, ці гэта ён пахваляў, ці ганіў. Вось-жа, раз у Саветах гэтае рэальнае жыцьцё зьмянілася, Колас ня мог вечна пісаць з памяці аб тым, што мінула, і мусіў адбіваць тое, што сягоньня дзеецца на беларускіх загонах.

Славячы сяньня — у трыццатыя ўгодкі паэтыцкае працы — Вялікага Мастака, мы сьхіляемся перад Ім і Ягонымі заслугамі для беларускага народу.

МАКСІМ ТАНК

Тры песьні

прысьв. ЯКУБУ КОЛАСУ

Эх, скрыпачы
з салаў'іньмі песьнямі,
хлопцы, дзяўчаты мае, маладзіцы —
трэба было-б пра жыцьцё саламянае,
трэба было-б галасіста заліцца!..
Перш прывітаем загоны мы родныя,
рэкі свае прывітаем, азёры,
ветру напевы на струнах свабодныя,
поле, бары, пералескі і горы!
Посьле пайдзем грамадой каляінамі,
там, дзе блакіт над зямлёю сагнуўся,
проста шляхамі паднебна-гусінымі —
мы — маладыя пяўцы Беларусі...

Першую песьню
сьпяём салаў'іную —
Дайце цымбалам размаху, разгону!
Можаце казкай назваць ці былінаю
песьню аб чорным, крывавым прыгоне.
Помніце, як упрагалі нас тройкамі?
як бізуном не адзін быў забіты?
як раз'ят жджалі паны-прыганятыя?
як мы вазілі айцоў-езуітаў?..
Плакалі болей як вербы зялёныя
маткі, сіроты, дзяўчаты, удовы,
нізка схіляючы плечы паклонамі,
нізка зьгінаючы плечы, галовы...

Можа ня хочаце
слухаць мінулае,
тое, тто сохамі пераарана?
Можа ня хочаце песьнямі, струнамі
рваць і старыя і сьвежыя раны?
Платы ня прымем за песьні вясёлыя!
Досыць калі мо' над струнамі самі
і безпрытульныя, босыя, голыя
рукі падыміце вы . . . . !
Мо' баіцёся, і вуснамі сінімі
ў спадчыне гора пакінеце ўнукам? —
Верым, што знойдуцца сілы арліныя,
грудзі ахвярныя, моцныя рукі!

Песьню другую
сьпяём весялейшую.
Шырака з захаду і да ўсходу
хмары навісьлі над Краем цямнейшыя,
хмары над хатамі і над народам.
Кажуць зрачыся курганаў і спадчыны!
. . . .
Хочаць — каб песьні забыліся матчыны!
. . . .
Хочаць — каб самі капалі магілы мы,
самі братом сваім, сёстрам і дзецям;
хочаць — каб вечна слугамі былі мы ім
і жабракамі хадзілі па сьвеце...

Гэй, скрыпачы,
песьняры галасістыя!
Што, — можа струны парваліся, змоўклі,
струны ня простыя, а серабрыстыя
і каляровыя, быццам вясёлкі?
Нас не вініце, што йграем ня весела, —
Песьня ня ходзіць яшчэ скамарохам!
Можа адным яна голавы зьвесіла,
але з другімі пайдзе буралломам!

Зноў запяём мы ад зораў разсеяных
густа над нівамі ў шэрую восень;
можа ад казак, што снамі навеяны
ад прыдарожных бярозаў і сосен...

Ёсьць дзьве дарогі
ў полі ды польныя...
Пойдзеш аднэй — жыць ты будзеш ў няволі;
пойдзеш другой — будзеш з сіламі чорнымі
цяжка змагацца за шчасьце, за волю...
Ты пераможаш і раны балючыя,
раны ад межаў Краіна залечыць,
плечы расправіць шырока-магучыя,
прыйдзе народ на вялікае веча.
Сонцам зазвоняць баразны ўзараныя,
закаласяцца густымі жытамі;
. . . . сяньня магілы стаптаныя
. . . . мы асыпім вянкамі!..

Гэй, песьняры
з салаў'інымі песьнямі,
хлопцы, дзяўчаты мае, маладзіцы!
Слухайце! можа ўжо сяньня прадвесьнямі
звоняць пад лёдам жывыя крыніцы!
А перад намі дарожанькі родныя,
шэрыя вёскі, бары і вазёры.
Сэрцам, грудзямі вітаем свабодныя
дні і напевы на чорных разорах!
Сяньня ідзём мы далей каляінамі,
там, дзе блакіт над зямлёю сагнуўся...
Слухай!.. Усходам, шляхамі гусінымі
вырай ляціць на палі Беларусі!

Вільня, 23. X. 36.

Аўтобіографія *)

Мае дзіцячыя гады прайшлі ў адзіноце. Бліжэйшымі маімі таварышамі-прыяцелямі былі два старшыя браты. Усё маё грамадзкае жыцьцё замыкалася ў вузкім коле сваёй сям'і. Бацька мой Міхал Казіміравіч Міцкевіч быў лясьніком. Чалавёк ён быў невялікай адукацыі: умеў расьпісацца, чытаць папольску і парускую. Разьбіраў нават і рукапіс. Маці мая Ганна Юраўна з Лёсікаў зусім няграматная, але разумная ад прыроды і добрая жанчына. У сям'і былі яшчэ два дзядькі, Пятрусь і Антось, людзі граматныя. Дзяцька Пятрусь быў у маскалёх на вайсковай службе, быў пісарам. Ён любіў чытаць кнігі, разьбіраўся ў іх і наагул шанаваў кнігу. Дзядзька Антось—малодшы брат бацькі, самы малодшы з маіх дзядзькоў,—здаў экзамен за курс пачатковай школы. Ён ведаў многа розных расказаў, казак, і ўмеў іх расказваць. Таксама ён ведаў і многа песень, але галоўным чынам з розных песельнікаў. Любіў дзяцей, умеў з імі ладзіць і добра знаў дзіцячую псыхолёгію. Ён-жа прышчапіў мне любасьць да навукі і вельмі зацікавіў байкамі Крылова, якога я потым амаль што ўсяго знаў напамяць.

Памятаць і адрозьніваць сябе ад вакольнага сьвету пачынаю прыблізна з 4-х гадоў. Радзіўся ў 1882 годзе 22-га кастрычніка па старому стылю, у засьценку Акінчыцах, дзе бацька меў першую пасаду лясьніка. Часта прыходзілася яму перабірацца з месца на месца — такая была панская воля лясьнічага. Самыя раньнія дзіцячыя гады мае прайшлі ў Сухошчыне, або Ластку. Гэта было глухое месца — поле, навокал лес ды адна толькі сяліба лясьніка — хата, гумно, хлеў. Часамі да нас заходзіў хто з сваякоў з Мікалаеўшчыны, адкуль былі родам бацькі, і заставаліся на некалькі дзён. Мне было вельмі цікава слухаць іх гутаркі. А гэтыя гутаркі былі самага рознастайнага характару. З гэтых гутарак знаёміўся я з невядомым мне жыцьцём за межамі нашае сялібы. Таксама часта бывалі ў нас і лясьнікі, аб'езчыкі і розныя панкі з лясьніцтва. Многа было гутарак аб лясьніковым побыце, аб праявах службовага характару, аб адносінах паноў да лясьніка. У гэтых адносінах было многа крыўднага і несправядлівага да лясьніка, і ў мяне з самага раньняга дзяцінства закідалася ў душу варожае пачуцьцё да паноў, а з часам яно яшчэ больш узмацнілася.

Любіў я вясною па ўсходзе сонца зашыцца куды-небудзь у куток і слухаць жаваранкаў. Мне тады здавалася, што я ведаю, аб чым яны сьпяваюць, я адрозьніваў вясёлыя і смутныя іх песьні, і мне нават здавалася, што жаваранкі ў другіх мясьцінах

*) Перадрукоўваем з кнігі: „Якуб Колас у літаратурнай крытыцы". Менск, ДВБ, 1926 г., бач. 162, 2 нлб., фармат 8⁰. (Рэд.).

ня так сьпяваюць, як яны. Да раньніх дзяцінных успамінаў адносяцца такія здарэньні. Засыпалі мы вясною яму, дзе была закопана бульба, яма залілася вадою. Я насіў трэскі, пасьлізнуўся на гліне і ўпаў у яму з вадою. Плюхаўся на версе, покі дзядзька Пятрусь ня выцягнуў. Другі раз мяне падпаілі на дажынках, я пачаў танцаваць на лаве, сьпіхнуўся з лавы і аб табарэт разьбіў сабе галаву. І ад гэтага часу застаўся ў мяне на галаве знак. Помню яшчэ адну навальніцу ўначы. Я страшна перапалохаўся, дрыжэў, а бацька мяне заспакойваў, узяўшы да сябе на пасьцель. Вучыцца чытаць прабаваў сам. Карыстаўся такім спосабам. Некаторыя літары чамусь рабілі на мяне большае ўражаньне, і я пытаў асобу досыць паважную ў гэтай справе, як называецца такая літара і стараўся запомніць яе назву. Такім парадкам вывучыў я ўсе літары, але чытаньне давалася на першых часах трудна. Тады ж нейк, калі мне было гадоў пяць, вылаяў я Бога апошнімі словамі за тое, што мне не ўдалося занесьці з хаты жару, загорнутага ў анучу і абложанага смалячкамі, каб разлажыць на полі агонь. Быў вялікі вецер, ён борзда разьдзьмуў вуглі, карчы загарэліся; я папёк сабе пальцы. Потым, як злосьць прайшла́, я вельмі востра і балюча адчуваў свой грэх, бо думаў, што Бог мне ніколі не даруе гэтага. Пярэбары з Сухошчыны ў Альбуць (у „Новай Зямлі“ апісана, як „Парэчча“) кладуць выразную мяжу ў маім жыцьці, і ў далейшым я ўжо добра памятую. Першая навука вялася дома. Дома я вучыўся дзьве зімы (я і два старэйшых браты). Аднаго „дарэктара”, вясковага хлопчыка, скончыўшага пачатковую школу, бацька наняў за 3 рублі на зіму. Потым нас адправілі ў сельскую школу. Альбуць найболей яскрава запала ў маёй памяці. Там была надзвычайна цікавая прырода. Лясьніковая пасада стаяла на бойкай дарозе, кудою ішлі і ехалі людзі. Многа рознага люду паперабывала ў нашай хаце. Нямоўчныя, цікавыя гутаркі новых людзей пашыралі мой запас ведаў аб людзях і жыцьці і далі мне багаты матэрыял для назіраньня. Лоўля рыбы, зьбіраньне ягад і грыбоў, работы на полі і на пузе, каля дому, — усё гэта давала багаты зьмест жыцьця ў Альбуці.

Там-жа я пачаў прабаваць і свае літаратурныя сілы, калі мне было гадоў 12. Помню, прачытаў свой верш „Вясна“ *) свайму бацьку; бацька праслухаў мяне ўважна, потым запытаў, ці праўда, што гэта напісаў я, і даў мне рубель гасьцінцу. Я любіў навуку, кнігу, мяне моцна цягнула і тое і другое. Вучыўся я добра. Бацька ўсімі сіламі стараўся пусьціць мяне ў навуку. У 15 гадоў паступіў я ў Несьвіскую настаўніцкую сэмінарыю. Падрыхтаваў мяне А. Лёсік. У 1902 г. мяне выпусьцілі адтуль настаўнікам. У сэмінарыі я досыць многа часу адводзіў і на складаньне вершаў. К таму часу ў мяне было напісана 16 баек. Пачаў пісаць паруску. Вялікі ўплыў меў на мяне ў сэ-

*) Яго ў мяне не захавалася.

мінарыі настаўнік Кудрынскі. У гэты час я шмат запісаў этнографічнага матэрыялу і перадаваў яго Кудрынскаму. Яшчэ ў пачатковай школе выпадкам папалі да мяне ў рукапісі беларускія вершы, як потым я даведаўся, напісаныя Янкам Лучынаю. Гэтыя вершы я вывучыў напамяць і любіў іх дэклямаваць. Сярод маіх родных і знаёмых гэтыя вершы карысталіся вялікім посьпехам („Паночку, даражэнькі, дай пораху крышку, калі маеш ўвагу на старога Грышку"). Я пісаў і пабеларуску. Адзін такі верш „Вясна", зьмешчаны ў „Песьнях жальбы", папаў на вочы Кудрынскаму. Ён мне сказаў: „Вот ваше настоящее призвание". Гэта заахвоціла мяне, я стаў пісаць больш. Некаторыя свае творы чытаў я на сваім сэмінарскім вечары, дзе я выступаў першы раз у жыцьці ў якасьці актора. Апроч вершаў, расказваў і беларускія жартлівыя расказікі і меў надзвычайны посьпех і сярод таварышоў, і настаўнікаў, і гарадзкой публікі, дзе было многа афіцэраў. Выступіў я, адзеты селянінам з-пад Глуску. Якраз здарыўся чалавек адтуль і ён даў мне сваю вопратку. Мае байкі і вершы юнацкага пэрыяду, сярод каторых пападаліся значныя па зьместу і па сужэту, не захаваліся. Тры такіх значных твораў таго часу я помню: „Страх", „Каля кастра", „Яшукова гара" (напісана ў першы год настаўніцтва на Палесьсі), пачатак вялікага па замыслу твору ў прозе „Адзін з сотні". У пачатку яго даны малюнак сэмінарскага жыцьця і зроблена абрысоўка героя Сошкіна; адзін сшыток з маімі творамі падхапіла бура, калі я быў у дарозе (летам 1902 г.) і занясла яго няведама куды. Многа літаратурнага, апрацаванага і неапрацаванага матэрыялу прапала ў мяне ў часе эвакуацыі 1915 г. Тоўсты сшыток рэвалюцыйных вершаў, для мяне асабліва цэнных цяпер, напісаных у 1906 г., прапаў бясьследна. Сярод гэтых твораў асабліва цікавым для мяне і для гісторыі настаўніцкага руху была паэма, прысьвечаная настаўніцкаму зьезду. Паэма складалася з 12 досыць значных песень. Два самыя раньнія вершы, напісаныя ў гадоў 16, я помню напамяць — адзін верш „Плач" і другі „Сьмех".

Беларускае гора - нядоля стукалася ва ўсе шчыліны мае душы. Але я ня мог усьведаміць сабе яго прычын. Нацыянальная мая сьведамасьць абудзілася ў мяне пазьней — у першыя гады настаўніцтва. „Беларусь", „Беларусь", як тэрміны, былі мне вядомы яшчэ ў пачатковай школе, але за гэтымі тэрмінамі ня было ў мяне рэальнага зьместу, толькі-ж яны мяне заўсёды краналі. Асаблівае ўражаньне яшчэ ў дзяцінстве зрабіў на мяне адзін рысунак, які спаткаў я ў нейкім рускім журнале, рысунак называўся „Белоруссия". На гэтым рысунку была паказана карчма, на парозе яе — карчмар, а каля парогу — п'яны беларусселянін. Селянін танцуе, а ўнізу подпіс: „Бяз музыкі, бяз дуды ходзяць ногі ня туды". Рысунак вельмі колёрытна перадаваў беларускі пэйзаж і сцэну.

Першыя гады настаўніцтва прайшлі на Палесьсі — у Люсіне

і Пінковічах. Люсіна — страшэнная глуш. Апісана „У Палескай глушы“. Тут я першы раз пазнаёміўся з нелегальнаю рэвалюцыйнаю літаратураю. Даваў яе мне адзін яўрэй, столяр па прафэсіі, мой недалёкі зямляк (з Стоўпцаў). Гэтыя брашуркі далі ход маім разважаньням у зусім новым кірунку і моцна зацікавілі мяне. Яны зрабілі ў мяне цэлы пераварот. Газэты радыкальнага характару, японская вайна, гутаркі настаўнікаў-землякоў, з якімі сустракаўся летам, пакіравалі мяне на рэвалюцыйную дарогу. У 1905 годзе я хоць і ня мог яшчэ добра орыентавацца ў партыях, але быў ужо заўзятым ворагам самадзяржаўя, і ў гэтым кірунку вёў работу. У выніку ўсяго гэтага — удзел у настаўніцкім зьезьдзе ў 1906 годзе. Выхад першых беларускіх часапісаў „Н. Д.“, „Н. Ніва“, знаёмства з Уласавым, з дзеячамі беларускіх часапісаў палажылі рэзкую мяжу ў маім жыцьці, і я цалкам аддаўся беларускай справе і беларускай літаратуры. У 1906 г. мяне звольнілі з настаўніцкай пасады. Зіму 1906 і 7 году я жыў у брата, адчыніў нелегальную школу, меў 12 вучняў. Вечарамі пісаў, заняўся, паміж іншым, складаньнем „Другога чытаньня для дзяцей беларусаў“. Вясною ў 1907 г. езьдзіў у Вільню, каб застацца ў рэдакцыі „Н. Н.“. Пажыў там тыдняў 6, і мяне, як паднадзорнага, выгнала адтуль паліцыя. У 1907 г. 1-га верасьня ізноў паехаў у рэдакцыю „Н. Н.“ з дазволам ад паліцыі жыць у Вільні. У пачатку 1908 г. паехаў у Магілеўшчыну ў адну школку, адкрытую панам Гарадзялкоўскім для сялян, і вёў там навучаньне пабеларуску, як і жадаў Гарадзялкоўскі. Матэрыялам для навучаньня чытаньню была „Наша Ніва“ і невялічкая літаратура, якую можна было дастаць тады. Лета 1908 г. заняўся прыватнымі лекцыямі ў Стоўпцах. У тым-жа годзе 15-га верасьня быў суд нада мною. Судзіла Віленская Судовая Палата. Далі 3 гады заключэньня ў крэпасьці. Адседзіў у Менску, у вастрозе многа пісаў дробных вершаў і пачаў пісаць „Новую Зямлю“. Вышаў з вастрогу ў 1911 г. 15-га верасьня. Увосень гэтага году пачаў пісаць „Сымона Музыку“. Напісаў І-ю часьць. 11-ты і пачатак 12 году быў бяз месца, жыў у Лунінцы ў свайго таварыша В. Філіповіча, займаўся з яго платнымі вучнямі на яго-ж кватэры. Красавік і пачатак мая жыў у Беларучы (25 вёрст ад Менску) у свайго таварыша і „дарэктара“ (гл. „Новая Зямля“) Івана Міцкевіча. Тут напісаў ІІ-ю частку „Сымона Музыкі“. У маі дастаў пасьведчаньне аб „благонадежности“ і дастаў пасаду настаўніка ў Купяцічах (12 вёрст ад Пінску), але адтуль зараз-жа перавёўся ў Пінск у ІІІ-яе прыходзкае вучылішча. У 1913 г. вясною жаніўся ў Пінску з настаўніцаю чыгуначнай школы Марыяй Каменскай. У 1914 г. забралі на вайну, але скора выпусьцілі. У 1915 г. змушаны быў пераехаць у Маскоўшчыну.

З 1915 г. па 1921 год жыў я ў Расіі: у Маскоўскай губэрні, у Пярмі, а потым у Куршчыне. У верасьні 1915 г. мяне забралі ў салдаты, быў у 55 запасным батальёне ў Маскве. З 1-га студзеня 1916 году па 1-е мая таго-ж году быў у ваенным Аляксан-

драўскім вучылішчы. Адтуль мяне назначылі ў Перм у запасны полк. У ліпені 1917 г. быў адпраўлен на фронт у Румынію начальнікам эшалёну дызэртыраў. У Румыніі я захварэў ліхаманкаю, жаўтухаю. Там-жа ў мяне пачаўся працэс у лёгкіх, і мяне эвакуавалі адтуль у Курскую губэрню ў гор. Абоянь, дзе жыла мая сям'я. Па дэкрэту савецкага ўраду ў пачатку 1918 году я быў звольнены з войска, як настаўнік. У Куршчыне быў увесь час настаўнікам, а потым школьным інструктарам. Цэлую зіму 1918-19 г. быў сакратаром камуністычнай ячэйкі ў сяле Ліпавец. У Ліпаўцы адчыніў хату-чытальню, арганізаваў бібліотэку, зьвязаўшыся з паліт-асьветнымі ўстановамі пры Чырвонай арміі. З прыходам Дзянікіна прышлося ўцякаць і хавацца. Калі была замацавана савецкая ўлада, я зноў паступіў на асьветную работу, быў школьным інструктарам. Схадзіў пяхотам ад школы да школы палавіну Курскай губэрні. Затым быў членам школьна-інструктарскай калегіі. 1920-21 г. жыў на вёсцы ў школе. Гэта быў галодны год. Прышлося заняцца цяжкаю працаю на зямлі пры школе, каб не прапасьці з голаду (гэты побыт апісан у расказе „Туды на захад"). За часы вайны і прабываньня ў Расіі пісаў мала, урыўкамі. У Куршчыне скончыў „Сымона Музыку" і напісаў адзін ці два разьдзелы з „Новай Зямлі". Сувязь з Беларусьсю была выпадковая з прычыны падзей ваенна-палітычнага характару. Моцна смуціўся па Беларусі. Дзякуючы ўраду БССР у маі 1921 г. пераехаў у Менск. Беларуская культурная справа, з якою я азнаёміўся па прыезьдзе ў Менск, і яе пэрспэктывы пры савецкім урадзе на мяне зрабілі найлепшае ўражаньне...

У Менску я стала аддаўся сваёй літаратурнай рабоце і ўвесь час меў і маю магчымасьць вясьці яе і бачыць плёны гэтае свае работы ў форме тых кніг, якія надрукаваны ў Менску ў апошні пэрыяд мае 20-гадовае літаратурнае работы.

Цяпер задуманы вельмі паважныя літаратурныя работы, да якіх я рыхтуюся і думаю грунтоўна ім аддацца.

З дарогі *)

Мінула шмат гадоў,
І многа зьмен за час той адбылося!
У подыхах вятроў
шмат страчана сьлядоў,
Бы красак тых у выцьвеўшым пракосе.

І часта, нібы ў сьне,
Дзяцінства мне мільгнецца прад вачамі,
Як песьня аб вясьне,
Аб той, што калісь мне
Няяснымі зьвінела галасамі.

Пазбыцца гэтых сноў
І зьяў былых ня здолеў я і сёньня:
Не, не — ды ўспомню зноў,
Той кут, дзе я даўно
Сагрэты быў пяскамі Наднямоньня.

Я сьвет угледзіў там,
Пазнаў складанасьць гам яго і тонаў,
Адчуў адвечны храм,
Злучэньне блеску, плям,
Дзе ўсё дрыжыць, зьвініць няпэўным звонам.

---

*) Гэты верш Аўтар прысьвячае заходне-беларускім землям. У мінулым годзе ўлетку Я. Колас, едучы на кангрэс абароны культуры ў Парыж і назад, праяжджаў праз Стоўпцы і іншыя паветы. Зразумелым дзеля гэтага загаловак вершу. Перадрукоўваем з дзьвюх частак вершу першую.

(Рэд.).

І колькі зьяў і чар
У памяці захована з былога —
Дзяцінства казак, мар
Прывабны скарб і дар,
Як першая ў жыцьці мая дарога!

Хоць сьлед пуцін маіх
Засыпан там ужо даўно вятрамі,
А бачу, як жывых
Мне блізкіх, дарагіх,

. . . .

Дзяцінства сны мае
І вобразы пад нёманаўскім сонцам!
Як часта паўстае
І вабіць і пяе
Акорд, адсьпеваны і злучаны з бясконцым!

3. I. 1936 г.

* * *

Дрыгва *)

(урыўкі)

I.

Панад Прыпяцьцю між лясоў, пяскоў і балот туліцца невялічкая вёсачка, хат можа так трыццаць ці сорак. І хаты няроўныя тут, як і людзі: адна большая, другая меншая, старэйшая ці навейшая, але хата дзеда Талаша ўсё-ж такі зварачае на сябе ўвагу. Ня так знадворным выглядам, як адзіноцтвам: стаіць яна на вотшыбе і ў блізкім суседзтве з хмызьняком ускрай балота. Побач з хатай, прыкрываючы яе ад летняга сонца, красуецца высокая разложыстая груша. Вясною, усыпаная белым цьветам, як маладая дзяўчына, яна проста аздабляе дзедаў двор, і ня толькі дзед Талаш, а і бусел з гнязда, змайстраванага на дзедавай клуні, залюбуецца ёю.

Нават калі ськінуць гадоў пятнаццаць з плячэй дзеда Талаша, то і тады ён быў ужо немалады: было яму тады гадоў семдзесят з хвосьцікам. А між тым, як раз у той час праславіўся дзед Талаш, як ваяка, ды які яшчэ ваяка!.. Да гэтага-ж часу ніхто ня ведаў аб ваяцкіх здольнасьцях дзеда Талаша. Праўда, бывалі выпадкі, калі дзеду Талашу здаралася пускаць у ход кулакі. Але гэта бывала тады, калі дзед Талаш падгуляе, а ліхі чалавек увядзе яго ў злосьць. Звычайна-ж ён быў чалавек сталы, ураўнаважаны і разважлівы, хоць, праўда, да пэўнай граніцы. Быстрыя цёмныя вочкі яго пазіралі ўдумліва, але ў іх часамі блукаў і затаены аганёк, гатовы разгарэцца ў адпаведныя мінуты цэлым пажарам рашучых учынкаў. Дзед Талаш любіць лес, балоты і сваю родную Прыпяць, дзе ён так спрытна езьдзіў на чаўне, ды лавіў рыбу. І стралок з яго быў ня кепскі: які-ж ён быў-бы паляшук, каб ня ўмеў добра страляць? На тое-ж яно і Палесьсе — бяз стрэл бы там абыйсьціся трудна.

Калі строга разьбірацца ў фактах, то хата, аб якой была тут гутарка, ня зусім дзедава хата. За доўгі час прывыклі называць яе Талашоваю хатаю. А сапраўды-ж яна належала дзедавай жонцы, цяпер бабцы Настулі. Шэсьдзесят гадоў таму назад прыстаў Талаш у прымы да Насьці Балыгі. Насьця была адна дачка ў бацькоў. Вось якім парадкам стаў Талаш уладаром гэтай хаты. А ўрэшце яно і ня так важна, каму належала хата, тым болей, што дзед Талаш перасыпаў яе і можа па справядлівасьці лічыцца яе гаспадаром. Важна было тое, што хата стаяла воддаль ад сяла і трохі ў бок ад людзкога вока. Да таго, як прыстаць у прымы, Талаш быў у пана за пастуха. І яшчэ, што можна адзначыць з мінулага дзеда Талаша, дык гэта тое, што ў яго бацькі было дванаццаць дзяцей. Васьмёра з іх паўмі-

*) Дрыгва, аповесьць, Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, Менск 1934, бач. 323, 1 нлб., фармат 8⁰.

рала малымі, а жыць засталіся два сыны, у тым ліку і дзед Талаш і дзьве дачкі.

Спакойна і павольна, як у зачарованым сьне, утуліўшыся ў балоты, нясе Прыпяць сухадоламу Дняпру сваю багатую даніну. Не сьпяшаецца яна выносіць дабро палескіх балот. А яго так многа, што ўсёроўна, сьпяшайся не сьпяшайся, гэтай работы ёй хопіць на доўгія гады. Можа і надзею страціла яна вынесьці хоць калі-небудзь гэта мора цёмна-ружовай вады з неабсяжных балот Палесься, і з гэтай прычыны яна такая павольная і флегматычная. Вось толькі тады, калі разгуляецца вецер над зялёнаю шчэцьцю лясоў, над круглымі купамі - шапкамі кучаравай лазы, над барадаўкамі - купінамі жорсткай асакі, тады яна нявetла пахмурнее, задрыжыць, затрасецца тысячамі хваль і сярдзіта шпурляе чаўны і чайкі-душагубкі ды голасна ўхліпвае ў прыбярэжных чаротах, як маці ўскрай магілы, дзе пахаваны яе дзеці. І дзед Талаш не адважваецца тады ад'яжджаць на сваім чаўне на сярэдзіну Прыпяці.

Затое-ж, як лагодна і ўтульна разляжыцца яна ў мяккіх берагох, калі супакоіцца вецер, а над Палесьсем рассыплецца сонца мільярдамі залатых крупак сьвятла! Спакой і цішыня пануюць тады над зялёнымі аксамітамі балот і лясоў. Бліскучаю сталёваю стужкаю зьяе Прыпяць, і толькі ў глыбозных чорных бухтах яе плёскаюцца самы, узьнімаючы срэбныя кругі-абручы. А дзед Талаш, пазіраючы на гэтыя забаўкі самоў, ссуне са лба на патыліцу саламяны капялюш, скажа сам сабе: „О, зьгінь твая маты! ось падчапіць-бы цябе, завалу“!

Спакойна і павольна, як у зачараваным сьне, цякло і само жыцьцё на Палесьсі, а водгульле ўсяго таго, што дзеялася на сьвеце, далятала сюды ў прыглушаных прасторамі Палесься тонах, або з такімі напластаваньнямі людзкой фантазіі, што ўжо трудна было вылушчыць з іх зерне праўды.

Але час настаў.

Закалыхалася, затраслося Палесьсе. І было гэта ўлетку, калі прышоў царскі загад аб мабілізацыі. Павалілі грамадою запасныя, дзяржучы кірунак на бліжэйшыя чыгуначныя станцыі, павалілі пад шумную музыку гармонікаў, песень і надрыўнога плачу мацярок і маладзіц. Хоць спачатку вайна вялася дзесь далёка, але водгульле яе ўсё галасьней і галасьней даносілася да ціхага Палесься. Пасылаліся з далёкага фронту пісьмы ў глухія закуткі палескіх вёсак, і часта адказам на гэтыя пісьмы быў горкі плач асірацелых дзяцей і маладых удоў. А вайна брала ўсё новыя ахвяры. І ня было канца вайне. Ды мала гэтага — фронт пачаў набліжацца сюды. Цяжка ўздыхалі дзяды і дакорліва ківалі галовамі. А дзед Талаш чуць быў у бяду не папаўся. Панёс ён у Петрыкаў прадаваць рыбу. Задзівіўся дужа дзед, калі пакупец пачаў адлічваць яму грошы папяровымі маркамі. На грошах былі царскія партрэты. На адной быў партрэт Мікалая другога і стаяла цыфра 10.

— Ты-ж гэта мне што даеш? — ў абурэньні запытаў дзед Талаш, палажыўшы на далонь папяровую марку.

— Першы раз іх бачыш? грошы цяпер пашлі такія. Паглядзі, царскі партрэт і напісана — 10 капеек.

Перавёў дзед Талаш вочы на царскі партрэт, патрос галавою.

— Ваяка, згінь твая маты!.. Даваяваўся, сволач ты, гіцаль, да таго, што ўжо і меднае капейкі ня маеш!

Натапырыў вушы паліцэйскі стражнік і да дзеда! Насілу адкараскаўся дзед Талаш ад гэтага ліха. І занатаваў сабе: на людзях трэба быць такім-жа асьцярожным, як і на балотнай дрыгве: ступіш ня так — і правалішся. Не разгледзішся — на гадзіну насунешся (бач. 3—7).

XXV.

Тысячамі дарог і ў розных кірунках зьбягае вясною сьнегавая вада. Як многа гэтых дарог і як разнастайны яны ў сваім руху і ў сіле свайго імкненьня.

Ёсьць нейкія зававлівыя чары, паэзія і хараство ў гэтых дарогах-ручаях, што пракладаюць пуціны вясьне і адноўленаму жыцьцю на зямлі, у іх мітусьлівым бегу і залівістым бульканьні, у вясёлым гомане і ў грозным шуме. Маленькія, кволыя, ледзь заметныя ў пачатку, струменяцца яны, як сьлёзы, на твары зямлі тоненькімі пакручастымі рысачкамі, набываючы сілы з кожным часам, з кожным крокам руху наперад. І колькі перашкод, колькі нечаканасьцяй у іх падарожжы! Кожная грудка лёду, кожны парог-гарбінка, выступ зямлі, узгорачак становяць ім замінкі і труднасьці ў іх імклівым руху. Але яны бягуць, несьціханна, бягуць бязупынна, дзе шпарчэй, дзе павольней, абыходзячы перашкоды, ці проста зносячы іх з свае дарогі, бягуць, покі не сальюцца ў бурлівыя патокі, покі не ачысьцяць зямлі ад сьнягоў, каб магутным разводзьдзем пралажыць шырокі шлях для яе новага жыцьця.

Тысячамі дарог і ў розных кірунках ідуць і людзі, шукаючы сабе прастору, волі і ўсяго таго, што называюць яны сваёю радасьцю і шчасьцем (бач. 186, 187).

— — — — — — — — — — — — — — — —

Юбілей Клясыка — сьвята народу

Аб гэнэзысе клясыка

Асабліває зьявішча: ніколі і нідзе — ніякія інстытуцыі ні аўторытэтныя асабістасьці ня ўзялі на сябе задачы вырашыць: — той ці іншы пісьменьнік падлягае абазначэньню, як клясык.

Пісьменьнікаў лёгка „прыдзяліць" да той, ці іншай групы, школы, кірунку; можна іх нараджаць, згодна з пастановай розных інстытуцыяў, celнымі ляўрамі. Некаторыя з пісьменьнікаў становяцца да сусьветнага конкурсу на тытул ляўрэата Нобэля, што дае ім магчымасьць вышэй падняцца на апалонаўскую гару. Але ніякія пастановы ці вызначэньні акадэміяў, якія быццам кіруюцца крытэрыямі чыста-літаратурнай спэцыфікі, ня здолелі-б падняць пісьменьніка да тэй вышыні Парнаса, дзе сярод „дзевяці муз" знайшоў сабе мейсца мастак-клясык.

Дарэмна будзем шукаць тлумачэньня гэтага зьявішча ў дэфініцыі самога паняцьця клясык, — якое найчасьцей даюць прыхільнікі літаратурнага формалізму. Нямецкае „Musterschriffsteller"—паняцьце схэматычнае і да таго яшчэ суб'ектыўнае. Калі-б мова была аб „прыкладным пісьменьніку", дык справа клясыка апынулася-б у руках судзьдзяў, якія знайшлі-б сродкі, каб прызнаць сябе годнымі і компэтэнтнымі да выдаваньня клясыку — пашпартоў.

Гэнэзы клясыка відавочна трэба шукаць на іншым грунце. Адзінай інстытуцыяй „вызначаючай" клясыка і даючай яму сваё ўпаважненьне гэта Вялікі Безыменны — Грамадзкасьць данай эпохі з усімі сваімі характэрнымі і пераважаючымі азнакамі соцыяльнага, нацыянальнага і культурнага характару. Ніякія санкцыі літаратурных „жрацоў" не патрэбны былі-б Якубу Коласу, каб ён стаў перад намі, як клясык нашай літаратуры, таксама, як ня трэба гэта было таму, хто „прыдумаў" лявоніху, хто змайстраваў цымбалы, хто першы запяяў народную песьню. Гэта даная канкрэтна — зложаная грамадзкасьць высунула таго, каторы высака-мастацкімі сродкамі будзе выражаць яе сьведамае і падсьведамае імкненьне, ідэалы, патэнцыянальныя магчымасьці.

З народу — да народу

„Мэтрыка нараджэньня" Якуба Коласа, як пісьменьніка, гавора: Хваля вялікага народнага прабуджэньня, арганічная частка гістарычнага ўздыму вызваленчай барацьбы ўсіх прыгнечаных народаў царскай Расеі, вынесла і кіравала нашага вялікага юбіляра-клясыка на творчы шлях. Праз глушы Палесься прано-

сіцца голас паэта. Праўда, гэты голас яшчэ гучыць адасобнена. Гэта яшчэ ня „кліч зямлі“ беларускай, а толькі паасобных яе сыноў, вышаўшых з народных гушчаў яе інтэлігентаў. І як-бы дзіўным, парадаксальным гэта не здавалася, — аднак гэта факт: самі з народу нясучы яму свае ідэі аб адраджэньні, яны, гэныя інтэлігенты, не пачулі яшчэ, што вызваленча-беларуская справа перастала ўжо быць справай адзінак-фантастаў, што гэта справа ўсьцяж глыбей уразаецца ў сьведамасьць народных гушчаў, бунтуе іх кроў, кліча іх да вялікага чыну.

Аднак ня быў-бы Якуб Колас клясыкам нашае літаратуры, мастаком, нясучым пачэсны тытул Народнага Паэта, калі-б не знайшоў той шлях, які вядзе яго — сына народу — да самога народу.

Няхай на славу Якуба Коласа будзе сказана: ён адным з першых з старэйшага пакаленьня беларускіх пісьменьнікаў на гэты шлях уступіў. Тады-ж і пачаўся найбуйнейшы росквіт яго таленту.

У творчасьці Якуба Коласа, у яго псыхоідэолёгічных настаўленьнях мы бачым працэс разьвіцьця. Працэс, праўда, не заўсёды раўнамерны, і як ува ўсякім працэсе, так і ў творчасьці Якуба Коласа можна ўбачыць розныя яго этапы. Гэта будзе і мэрыторычна і мэтодолёгічна правільным.

Сьвята, якое абавязвае

Сьвяткуе 30-ці гадовы юбілей творчасьці Якуба Коласа ўвесь беларускі народ, а разам з ім і ўсе іншыя народы не асьлепленыя шавіністычнай ненавісьцю да творчага чалавечага духа. Бо Якуб Колас — гэта падпора вялікага гмаху ўселюдзкай культуры.

Каб гэта наша сьвята поўнасьцю адказвала значэньню Вялікага Мастака ў нашым нацыянальна-культурным жыцьці, неабходны да гэтага згуртаваны чын усяго беларускага народу. Адзначым тады гэты юбілей узмоцненымі высілкамі на полі народнай асьветы. Памятуючы шлях разьвіцьця Якуба Коласа, акружым нашых маладых, шмат цярпячых пісьменьнікаў, цёплым, культурнатворчым асяродзьдзем, якое паможа новаму пакаленьню усвоіць вялікі досьлед Коласа, Купалы, як і наагул лепшых прадстаўнікоў чалавечай культуры.

У чэсьць юбілею нашага Клясыка ўзмоцнім свае натугі, каб супольнымі сіламі ўтварыць у Вільні гмах беларускай культуры, каб у нашых вёсках утварыць народныя дамы яго імені. — Гэта будзе лепшы доказ нашай вялікай пашаны для Народнага Паэта — шмат заслужанага для нашай народнай справы — Якуба Коласа.

АД. СТАНКЕВІЧ

У „палоне” паэзіі Якуба Коласа

(з нагоды 30-летняга юбілею яго літаратурнага творства)

Паза асабістым жыцьцём чалавека бываюць на сьвеце факты, жыцьцёвыя праявы, якія на некаторых людзей маюць асаблівы і рашучы ўплыў, якія трымаюць яго як-бы ў палоне, і якія якбы заварожываюць псыхіку чалавека праз усё яго жыцьцё.

Бываюць так-жа і ў асабістым жыцьці чалавека здарэньні, аб якіх ён ніколі не забываецца, якія жывы і вечны сьлед пакідаюць на яго душы. Мінаюць гады, мінае і зьмяняецца з імі жыцьцё чалавека, а гэныя здарэньні, як жывая пячаць, астаюцца нязьменнымі і непарушнымі. Больш таго — гэныя здарэньні асаблівую яшчэ праяўляюць дзейнасьць у душы чалавека — ўспаміны аб іх твораць у нас усьцяж нешта новае, лучаць мінуўшчыну з сучаснасьцяй, узбагачаюць псыхічнае жыцьцё наша.

У маім жыцьці, калі яго разглядаць з пункту беларускай адраджэнска-вызвольнай ідэі, асаблівым, аб'ектыўным і суб'ектыўным фактам, ад пачатку аж да сяньня, ёсьць вылучнае і рашучае дзеяньне літаратурна-мастацкага творства Якуба Коласа на маю псыхіку і маё з ім асабістае спатканьне.

У 1910 годзе я ўступіў у Віленскую Духоўную Каталіцкую Сэмінарыю. Агулам кажучы, быў я ўжо сьведамым беларусам. Сьведамасьць аднак гэта была яшчэ дужа сырая, няглыбокая, нявыканчаная. Праўда, проціўставіцца польскай нацыянальнасьці, ня гледзячы на атмасфэру польскага каталіцтва, у якім я гадаваўся, на дзіва і для мяне самога, удалося мне лёгка. Жыцьцё аднак праз увесь час майго юнацтва ўсьцяж стаўляла прада мною спакусы, што накіроўлівалі мяне ў бок польскасьці. Але нямнога трэба было мне змаганьня з імі, каб астацца верным беларускай стыхіі. Крыху інакш справа выглядала з расейшчынай. Прабыўшы ад 1905 да 1909 году ў расейскай гарадзкой школе ў Ашмяне, я пачынаў звыкацца з казённай навукай, што рускі народ дзеліцца на тры пададдзелы: на велікарусаў, маларусаў і беларусаў, і што я дзеля гэтага сапраўды беларус, але што мая гэта нацыя не самастойная, а ёсьць толькі часткай агульна-рускай нацыі. „Беларуская Дудка“ Багушэвіча, асабліва яго прадмова да яе, упорыстыя, часта аж да забыцьця аб усім іншым, студыі з гэтага боку дапамаглі мне мінуць небясьпеку і абедзьвімі нагамі цьвёрда стаць на беларускі шлях. Гэтак нацыянальна скрысталізаваўся я ў першых двух гадох маей навукі ў сэмінарыі ў 1910—11 годзе. Далейшае шліфаваньне і разьвіваньне маей беларускай сьведа-

масьці і ідэолёгіі адбывалася асаблівым спосабам пад уплывам паэзіі Коласа.

Ад восені 1906 году ў Вільні выходзіла „Наша Ніва“. Тайком ад улады сэмінарысты даставалі яе і чыталі. Найбольшае на мяне ў гэтым часапісе рабілі ўражаньне вершы Коласа. Высока мастацкія і адначасна фотографічна праўдзівыя малюнкі беларускай прыроды і беларускага быту, глыбока-спакойныя і поўныя безграічнай любові да ўсяго гэтага настроі паэзіі Коласа, змушалі біцца ў тахт з ей маё сэрца, выклікалі ў мяне нейкую дагэтуль няведамую любоў да Беларусі і беларускага народу і парывалі ў краіну лепшага, ідэальнага беларускага сьвету. І іншыя сэмінарысты беларусы дазнавалі падобнага ўражаньня ад паэзіі Коласа. Больш таго — нават рашучыя нашы праціўнікі, слухаючы ці чытаючы Коласа паэзію, задумваліся, псыхічна разаружваліся і мякчэлі ў сваім упорстве і ненавісьці да справы беларускага адраджэньня.

Але ня толькі праз яго паэзію ў „Нашай Ніве“ пазнаў я Коласа, які ўзяў у „палон“ душу маю. Час ад часу ўдавалася бываць у рэдакцыі „Нашай Нівы“. Адзін раз, здаецца ў 1911 г., падчас такіх адведзінаў гэнай рэдакцыі, якая мясьцілася ці на Віленскай 20 ці на Завальнай 7 у Вільні, я спаткаў Івана Луцкевіча і Вацлава Ластоўскага. З імі знаўся я ўжо добра. Але апрача іх быў там чалавек, якога я спаткаў першы раз. Сядзеў ён у кутку пад акном маўкліва й задуменна, уважна прыглядаючыся да мяне. Якое-ж маё было зьдзіўленьне і радасьць, калі Іван Луцкевіч падвёў мяне да гэнага незнаёмага і сказаў: будзьце знаёмы, гэта беларускі паэт Якуб Колас. Радасьці маей ня было канца. Я глыбака быў узварушаны. Хацеў нешта Коласу сказаць прыемнае, але нічога ня вышла. Колас ня быў словаахвотлівым, уважна і пытальна глядзеў на мяне і маўчаў. Відзячы наш клопат, Іван Луцкевіч бліжэй тлумачыў, хто я такі, і адначасна паказваў нам старадаўныя беларускія забыткі, сабраныя ім для беларускага музэю. Прамовіў і Колас. Цешыўся, што я стаў на беларускі шлях і жадаў вытрываласьці. Мне-ж толькі гэтага і трэба было. Чытаючы паэзію Коласа, мне часамі прыходзілі сумнівы, што гэта можа паэзія і толькі, што можа і сам Колас у сапраўднасьці інакш глядзіць на сьвет. Асабістае спатканьне, як змору, разьвеяла ўсякія сумнівы, усякія чорныя думкі.

Гэта было маё адзінае спатканьне з Коласам, якое ў памяці аднак маей асталося назаўсёды. Здаецца мне, што Колас тады, гледзячы на мяне, як-бы пытаўся: няўжо-ж ты вытрываеш ў беларускай стыхіі, няўжо-ж ты выпутаешся з чужых цянётаў і сапраўды пойдзеш па беларускім шляху? Тымчасам для мяне ўжо тады ня было ніякіх у гэтай справе сумніваў. Колас і яго паэзія даканалі ў гэтай справе ў душы маей рэшты. Было гэта 25 гадоў таму, а помніцца як сяньня.

Асабістае спатканьне маё з Якубам Коласам яшчэ больш узмацавала дзейнасьць ягонай на мяне паэзіі, якая назаўсёды

асталася „дамай“ майго сэрца. Калі вышаў у сьвет друкам зборнік яго вершаў „Песьні Жальбы“, я з імі ўжо не расставаўся ніколі. Пасьля сэмінарыі апынуўшыся на студыях у Духоўнай Акадэміі ў цяперашнім Ленінградзе, а тады яшчэ Пецярбурзе, а пасьля Петраградзе, я далей знаходзіўся пад рашучым уплывам чараў паэзіі Коласа, далей не расстаючыся з „Песьнямі Жальбы“ і прагавіта прачытваючы па некалькі разоў так-жа вершы Коласа, што друкаваліся ў тагочасных беларускіх часапісах, асабліва паэму „Новая Зямля“, фрагмэнты якой друкаваліся на пачатку рэвалюцыі ў беларускіх газэтах, што выходзілі тады ў Менску.

Лацінская пагаворка кажа: „bonum diffusivum est“ — гэта знача, што яно з натуры сваей імкнецца да таго, каб удзяліцца каму. У акадэміі існаваў гурток беларускіх студэнтаў. Такі-ж у тым-жа Петраградзе існаваў гурток беларусаў у сэмінарыі. Адзін гурток з другім былі ў кантакце. Удавалася нават часамі прабірацца з сэмінарыі ў акадэмію на ўзаемныя нарады і нават часам наладжваць рэфэраты. З такім рэфэратам быў я ў сэмінарыстаў 31. III. 1918 г., за пару месяцаў да аканчальнага майго выезду з Петраграду. І дзіўная рэч. Тэма майго рэфэрату была гэткая: „Якуб Колас і яго паэзія“. Саньня знаходжу ў сваім архіве гэны рэфэрат і вось што між іншым у ім чытаю. „Прыемна быць разам, жыць супольна людзям, у каторых адны думкі, адны жаданьні, сэрца каторых б'ецца ў адзін тон і адна іх ажыўляе душа... А можа думаеце, што гэта няпраўда, што я з фантазіі такую думку выснаваў? Не. Вось чатыры гады мінае, як я тут у Петраградзе, і праз усе гэтыя гады ў вашых асобах і ўва ўсіх тых, што мяне апярэдзілі, я знаходжу пацьвярджэньне сваіх думак. Бо як-жа! Падчас сумнага настрою душы, падчас цяжкога духовага перажываньня, падчас завярухі ў сэрцы, — мы адны другіх найлепш разумелі, мы, у каторых супольная ідэя. Дык вось сяньня, у час майго з вамі разьвітаньня, хацелася-б з вамі, браточкі, яшчэ раз, раз апошні, пагаварыць шчыра, ад сэрца. Але хто-ж раскалыша гэта сэрца, хто яго струны паруша, каб яшчэ жывей і больш суладна яны зайгралі? А калі жаданьні нашы споўняцца, дык хто-ж утрымае тон гэтай музыкі на аднэй вышыні, на аднэй роўнай, нефальшывай ноце? Загаловак тэмы вам адкажа. Зробіць гэта той, хто як вецер у вясеньнюю цёмную ноч жаласна плача ў пушчы-Беларусі, галосячы над народу сконам, хто як родная маці над калыскай дзіцяці свайго бязсонна ночку каратае, пяець аб долі-нядолі свайго роднага народу, яго будучыню гадае, хто сам жывой ёсьць Беларусяй, люстрам пакутнага жыцьця яе, той, хто будучы вучыцелем-народнікам шмат і вельмі шмат супольнага мае з намі... Зробіць гэта паэтычная думка аб пакутнай Беларусі, аб долі-нядолі дзетак яе... паэтычная думка таго, каму імя Якуб Колас“...

І далей, аж да сяньня, паэзія Коласа мела і мае на мяне асаблівую, вылучную дзейнасьць. У 1918 і 1919 гг. прышлося мне за беларускую справу пабываць за рубяжамі этнографічнай

Беларусі аж у Драгічыне над Бугам, куды мяне саслала мая духоўная ўлада. І тут нішто так мяне ня цешыла, не падтрымлівала на духу, як паэзія Коласа, вершы якога заўсёды меў я пры сабе і чытаў іх па некалькі разоў, разводзячы тугу па Бацькаўшчыне і забываючыся аб дазнанай крыўдзе. І цяпер, у хвіліну сумніваў і духовай прострацыі, у хвіліны духовай зьнямогі, паэзія Коласа прыводзіць мяне да роўнавагі, супакойвае, улівае новыя сілы і варочае веру ў зьдзейсьненьне вялікага нашага ідэалу — адраджэньня і вызваленьня беларускага народу.

„Ой вы, дарожанькі людзкія, пуцінкі вузкія, крывыя!.. Прасторны шлях! калі-ж, калі ты закрасуеш на зямлі і злучыш нашы ўсе дарогі?“—пытае Колас, канчаючы сваю паэму „Новая Зямля“.

Прасторны беларускі шлях ужо красуе, ужо злучаюцца нашыя дарогі ў Тваіх песьнях, у Тваей паэзіі, Вялікі Пясьняр наш, і, пакрысе, у рэальнасьці.

Вышэйсказанае няхай будзе маім скромным ляўравым лістком у вянок на голаў Вялікага Беларускага Народнага Песьняра з нагоды 30-лецьця мастацка-літаратурнага Яго творства.

А. УЛАСАЎ

Якуб Колас і „Наша Ніва”.

(успаміны)

Мне ўжо 62 гады. Я належу да пакаленьня, якое адыйшло ў гісторыю. 90 проц. маіх равесьнікаў ужо скончылі зямную кар'еру. Я яшчэ на пару гадоў затрымаўся. Варта было-б мне напісаць свой „кінэматаграф“ на працягу якіх 35 гадоў для беларускай моладзі. Можа і ўдасца гэта зрабіць перад сьмерцяй. Малады пясьняр Жылка (ён ужо на тым сьвеце!) мне купіў тоўсты сшыток на гэта.

Калі я быў студэнтам, то мне прарочылі кар'еру літэратара-гумарыста, а я як раз усё жыцьцё пісаў на праклятыя палітычныя і эканамічныя тэмы. І цяпер прасілі мяне напісаць пра Якуба Коласа. Я па старой паганай прывычцы (як жартавалі з ваеннага пісара, каторы ўмеў танцаваць толькі ад печкі!) мушу трохі паглядзець на жыцьцё кругом. На сьвет гляджу з заходнебеларускіх земляў. Хацелася-б мне пабываць яшчэ ў Менску. — Калісь старая „Беларуская Рэвалюцыйная Грамада“ у пракламацыях нясьмела пісала ў 1905/6 г.: „аўтаномія Беларусі з соймам у Вільні альбо ў Менску“. Менск неспадзявана выскачыў першы на сталіцу. Вось я бы хацеў паглядзець на новае там жыцьцё

і „напіцца вады са Сьвіслачы“. Кідаць мае бедныя, заняпалыя, з сумным жыцьцём народу, заходне-беларускія землі я не хачу. У мяне астаўся сэнтымэнт да скрыўджаных... У нас тут у ходу песьня:

„Rolnik nasz poczciwy,
Jaki on jest kciwy:
Pije liter z denatury,
A w butach ma dziury“...

* * *

Мне трэба адыйсьціся ад цяперашніх часоў і з 1936 году пераскочыць на 30 гадоў узад. Бачыце, ніяк не магу адразу перайсьці на „заданную тэму“.

Бунтавалі, баставалі ўсе студэнты, далучыліся работнікі і сяляне, самадзяржаўе скранулі з гранітнага фундамэнту. Дума... Народныя выбарныя...

Энэргія была ў нас колёсальная, энтузіязм моладасьці. Вера горы перасоўвае! Менск 1905/6 г. Пасьля першых маіх мітынгаў у Радашкавічах, гдзе я гаварыў страшэнныя штукі: „цара ня трэба“ і т. п., —я, як кажуць далікатныя местачковыя нашы жыды, „трошкі“ ўцёк, уначы, зімой, абсаджаным бярозамі старым трактам у Менск. Селянін падганяў каня свайго з пашаны да пасажыра: „Гэй, пролетарый усіх старон... саедзіняйся!“ У Менску я з Бурбісам і братамі Луцкевічамі і яшчэ з кучай моладзі арганізавалі забастоўкі шаўцоў, парыкмахераў, музыкантаў... Стэцкевіч („Аганёк“) друкаваў проклямацыі; пускалі іх па вёсках і т. д.

Я ня меў кватэры, быў падпольнік. Начаваў кожны дзень у другім мейсцы, а пару разоў і на сквэры „пільнуючы ўсходу сонца“... Здароўе было жалезнае, энэргія маладая! З паўгоду так рыскаў, як воўк, а й Іван Луцкевіч цэлы год у Вільні так бадзяўся. Гэта я пішу для характэрыстыкі дэкарацыі таго часу.

Раз на вуліцы спатыкаю Леаніда Канстантінаўскага *), прыяцеля майго і друга са школьнай лаўкі ў Лібаве. Леанід ажаніўся, быў багаты, наймаў віллу ў Менску. Я знайшоў у яго і стол, і дом. Яго жонка была тыпам тургенеўскіх кабет. Зараз, мае чытачы, дабярэмся і да Якуба Коласа. Гэта я малюю фон абраза.

Ехаў я — раней, чым тое дзеялася — у трэцяй клясе. Раптам уваліваецца лапцяватая грамада беларусаў з Нёмана. Загналі плыты ў Коўну, едуць назад па Нёмане, каб ізноў гнаць дрэва. Мяне тады расьпірала, як кажуць цяпер, ад агітацыі; разгаварыўся скора, чытаў вершы Мацея Бурачка. Тады ня было яшчэ ні Купалы ні Коласа! Плытнікі з в. Мікалаеўшчыны. Гэта вёска

*) Леанід быў ранены на вайне ў 1914 г. і цяпер недзе на Украіне.

дастаўляла ня толькі „рачных ваўкоў“, але і вучыцялёў народных, як м. Валожын — рабінаў. Мне гавораць: „а ў нас адзін настаўнік „сьмешна“ чытае панашаму!“

Праз нейкі час быў у Менску зьезд вучыцялёў, на дачы на Камароўцы. На гэтым зьезьдзе я спытаўся: хто тут з вас з Мікалаеўшчыны беларускія вершы фабрыкуець? — Выходзіць лабаценькі, з чорнай маладзенькай бародкай. Від у яго быў не саўсім забіты сэмінарскай трафарэтнай вучобай.

Я павёў гэтае жамчужнае зерне да Леаніда Канстантінаўскага. Ветлівыя гаспадары, шыкарная вячэра. Мой вучыцель разьвярнуўся. „Но лишь божественный глагол до слуха чуткого коснется, душа поэта встрепенется, как пробудившійся орел!“ Хлапец пераабразіўся, вочы яго зьялі, твар адухатварыўся. Мілагучныя рыфмы сьпявалі ў яго.

Мы ўсе зразумелі, што перад намі — узыходзячая зорка беларускай паэзіі.

* * *

Браце Якубе! Можа, прачытаўшы гэта, ты ўспомніш нашу залатую моладасьць і моладасьць беларускага адраджэньня і наш стары „губернскій город“ Менск. Можа, пішучы аб Табе, я, адышоўшы ад актыўнай работы, стары, ужо ня ўмею трымаць нос па ветру і ня ўсім дагаджу: ня прывык я гэтага рабіць. — Чуў твой голас, Якубе, праз радыё, чуў і гарачае прывітаньне менскай публікі. Прайшоў Ты праз жыцьцё, зрываючы, як і маё пакаленьне, мала кветак і многа церняў і турмы. Для мяне ўсё-ж гэта гонар, што я першы Цябе расшукаў — не праз абвесткі ў газэтах, а праз лапцяватых мужыкоў! Я — твой хросны бацька. Нагародай мне было-б, каб што-небудзь зрабіць для „Каласкоў“ Беларусі, дзе я дажываю свой век! З маей, цяпер набошчыцы, радашкоўскай гімназіі, выйшаў малады паэт Танк, і многа іх яшчэ выявілася-б пры добрых варунках асьветы...

* * *

Помню, як я ў Менску хадзіў у турму да Коласа. За гэны самы вучыцельскі зьезд ён дастаў тры гады. Помню, недзе пад Брэсцкім вагзалам, у завулку, драўляную турму, тыпу павятовай турмы, досыць патрыархальную. „Старшой“ Пікулік, чалавек дабрадушны, убачыўшы мяне з дарамі прыроды, гаварыў: „Пазавіце Кінстінтіна!“ З нутра турмы выходзіць неяк баязьліва наш паэт. Сядаем на лавачцы каля варот, „пасямейнаму“ неяк сядзяць Пікулік і стражнік...

Я шмат раз адведываў людзей у турмах. Ніколі ня трэба пытацца: як маешся? а найлепш расказаць што-небудзь вясёлае, анэгдоты. Іх любіў слухаць і Пікулік.

Калі К. Міцкевіч адсядзеў турму, Іван Луцкевіч, каторы ведаў увесь край, — у кожным закавулку ён меў знаёмых, — намовіў адну сымпатычную старую паню Т. Гордзялкоўскую (кабету тыпу Э. Арэшчыхі) зрабіць беларускую школу тайную, і Якуба зрабілі вучыцелем яе. Ён быў першы беларускі вучыцель першай беларускай школы. Як гэта ўсё было там, я ня памятую.

* * *

Цяпер пяройдзем да „Нашай Нівы“. Пачатак беларускай прэсы быў увесь на ахвярах і цяжкай начной працы. Паўтраця году мы з Антонам Луцкевічам пісалі ад вечара да раніцы. Як мы вытрымалі гэту работу, я не разумею. Моладасьць, нязломная воля і энтузіязм! Трэба было выраблять літаратурную мову. Пазьней зьявіліся памацнікі. Прыходзілі да нас як у „Запарожскую сеч“. Помню, зайшоў да нас хлапец, з выгляду падобны да клерыка, каторы адразу сеў пісаць сотні адрасоў. Піша дзень, другі, трэці... Прыклеіўся да работы. Пытаюся ў Івана, як яго прозьвішча? Іван кажа: „а чорт яго ведае! — яле малайчына“. Аказалася, ніхто яго ня ведае, а гэты малец прыклеіўся надоўга.

Так папаў да нас і „дзядзька Барадаты“. Апрацовываў матарыял! Прышоў з сытым тварам, але, папрацаваўшы пару месяцаў, пабялеў, і нэрвы, як іскрыпка зрабіліся. Затое мысьль, стыль зрабіўся лёгкі. „Барадаты“ раніцай раз пісаў і кажа: „я пасьля абеду дакончу, а цяпер бягу ў суд, як сьведка“. Няма яго ні на абед (3 абеды мы дзялілі на 5 чалавек), ні ўвечары. Іван паляцеў разьнюхаць, гдзе ён дзеўся. „Барадатаму“ што называецца „пашанцавала“: тры сьведкі зрабілі яго вінаватым і дастаў 10 гадоў ссылкі ў Сібір за с.-р. партыю... Праз месяц „Барадатага“ ў кайданох павялі з партыяй на вагзал. Потым мы яму паслалі ў вокладцы кнігі „акуляры“, г. зн. фальшывы пашпарт і ён у Сібіры ажаніўся ды абсеў.

* * *

Прыбыў у рэдакцыю да нас урэшце і Якуб Колас. Далі яму адпаведную работу.

Прысылалі ў „Нашу Ніву“ многа вершаў, расказаў, карэспандэнцыяў. Колас меў многа працы. З благіх вершаў рабіў добрыя, і местачковы вершаплёт, прачытаўшы свае вершы сваім знаёмым, дзівіўся разам з імі: якія пекныя вершы!

Колас унёс многа гумару ў рэдакцыю; чалавек ён быў жыцьцярадасны, у жыцьцё нашае „богемы“ ўносіў у вольныя хвіліны многа вясельля.

Помню, раз цэлую ноч працавалі ў рэдакцыі на рагу Завальнай і Троцкай у Вільні. Колас а гадзіне 3 уночы кажа: „Вот бы выпіў гарэлкі!“ — „На грошы і купі!“ — Колас за паўгадзіны вярнуўся з цёмнай вуліцы і кажа: „Няма, усё зачынена! Тут і генэрал не дастане!“ — Я пайшоў. Пытаюся ў гарадавога: „Калі ласка, гдзе тут можна дастаць гарэлкі?“ — „Ды вось, у стоража пад № 58“...

* * *

Маладыя мае чытачы! Вашае жыцьцё ўсё ўперадзе. Вашая вера ў шчасьлівую будучыну, яна недзе за ружовымі хмаркамі — лятуценьнямі, — там адкрываюцца новыя і новыя далі. Я ўжо прайшоў праз усе далі: жыцьцё іх мне адкрывала год за годам. Нашае пакаленьне несла свае ідэалы вызваленьня народаў пакрыўджаных, занядбаных, — пашанаваньня ўсіх цяжка працуючых, на карысьць не сваю, а чужую. Мае равесьнікі і аднадумцы клалі свае маладыя гады, сваё асабістае шчасьце, сваё здароўе, сваё жыцьцё. Многа іх звалілася ў баразну, аддаўшы ўсе сілы даканца.

Гдзе мае таварышы старыя? Большасьць сьпіць у зямлі сырой. Праз іх трупы ідуць новыя барцы, утрымліваючыя заваяваныя папярэднікамі пазіцыі, сьмела імкнучыся далей — уперад. І як нашае пакаленьне старалася вызваляць і дух народу з рабскае залежнасьці ад чужынцаў, так і вы, маладыя, мусіце гэта рабіць і стварыць новы пэрыяд, які-б адыграў ня меншую ролю ў беларускім рэнэсансе, як пэрыяд „нашаніўскі“.

НАРАЧ

(частка чацьвертая)

1.

Кашуля шырокая з порту,
лапці з пяньковых абор,
ў шапцы салдацкай падзёртай
ходзе па вёсцы Прахор.
Ходзе ад хаты да хаты:
— Гэй, нарачанскі народ,
госьці прыехалі ў сваты —
клічаць зьбірацца на сход!..

А вецер з-за возера сіні,
з пахам смалістай сасны,
суха кудзеліць чупрыну,
рве на грудзёх рызманы;
гне вербалозныя веткі
шэпчучы казкі свае
і на разьвешаных сетках
шэрыя песьні пяе.

— Эх, рыбныя дні наступаюць,—
дарма накормяць сірот!..—
Ходзе Прахор і склікае
тлумы галодных на сход.
Хаты прачнуліся, гумны
і затрашчалі калкі, —
гразкаю вуліцай шумна
хмарай пайшлі рыбакі...

2.

Ў хаце Архіпа
рана зьбіраўся тлум.
Пужліва застылі малыя разьбітыя шыбы.
Горкі і сіні дым ад махоркі, шум
і пахне балотам, вясной, недасоленай рыбай.

Каля стала улада. Загад: маўчаць!
Ды толькі шуміць да адказу набітая хата.
Плача ў калысцы з соскай пустой дзіця
і плачаць чагось сіратліва
пад ложкам ягняты...

А за вакном, далёка, відаць рабы,
з пад сьнегу, гасьцінец,
а далей бярозы і гоні,
ськівы разораў, сьнег і межаў гарбы —
эх! як мазалі на працоўных сялянскіх далонях.
— — — — — — — — — — — — — — — —

Із лавы падняўся
солтыс грамадзкі,
клінам задзёр бараду—вехаць іржавай саломы.
Камнем лягла цішыня на плечах рыбацкіх;
кашаль сухі надрываў грудзі Сымону старому.
Солтыс пачаў гаварыць: —
урад, быццам, хоча
сам рыбаком памагчы рыбу лавіць невадамі...
. . . .
шумна, ў кутку, старыкі нат замахалі рукамі.
Посьле з-за столу падняўся хтось ў акулярах: —
трэба урад шанаваць . . . .

З таўпы

Але, як жыць нам, скажы, на дошчатых нарах?
Нат палыном з лебядой нас не пракормяць загоны!..

Посьле другі гаварыў:
усе мы павінны
спраўна плаціць падачкі, ціха жыць, не бунтавацца
і працаваць на карысьць народу, айчыны...
з нэндзы каб выйсьці, з бяды—болей ўлажыць
трэба працы...
Сяньня будуем для вас дарогі, гасьцінцы;
сяньня культуру нясём мы ў вашы вёскі і сёлы.
Можаце самі і дзеці вашы вучыцца
могуць задарма ў сьвятліцах і ў урадовых школах...

Сыпаў славамі — рыбай з падзёртага саку.
Посьле успомніў яшчэ голад, сялянскае гора...
Сам над рыбацкаю доляй ледзь не заплакаў
ды, мімаходам, пачаў і...
гаварыць пра вазёры...

А цішыня прытаілася паміж плечаў...
Толькі, часамі, шопат хусткі галовы ўскалыша,
змые натоўп,
і згасьне ў кутках каля печы...
Ціха, чуваць, шэры дождж шыбы ваконныя ліжа...

Сымон

Я ўжо, паны, ня рыбак
і сілы ня маю,
сілы сваей маладой... Дні ўжо мае мінавалі.
Рукі ня так ужо моцна вёслы трымаюць
і на руках мазалёў больш, як у пана мэдаляў...
Шмат каштавала і нам Міколы айчына,
гэта . . . .

Сяньня на брацкіх магілах
вербы чупрыны
спусьцілі,— толькі ў грудзёх не загаіліся раны...
А паглядзіш на зямлю, як вокам ахопіш,—
ямы, канавы — рубцы не зажылі і чарнеюць...
Плугам нараз выарыш дрот, косьці з акопаў,
пліты разьбітых магіл —
рускіх, нямецкіх траншэяў...—

І успаміны прыйшлі
з дарог, з над вазёраў,
дзе непагодай ліхой вербы сумуюць маркотна.
Ўсталі мінуўшыя дні з пад чорных разораў...
Мые, за вокнамі, дождж поле —
рабыя палотны.—

Кажыш: дарогі, гасьцінцы... Чорнага поту
шмат пралілося і там з рук ды з збалелага карку.
Ўсюды ўлажылі нямала сілы, работы,—
вёска пацьвердзіць уся,
як мы абраблялі шарваркі...

Так і асьвета, паны... Ня шмат павіднела
ў нашых саломенных хатах . . . .
. . . .
. . . .

Дзень непагодны, ветраны, шэры
невадам цяжкім вісіць,
з стрэхаў спусьціўшыся мокне...
І шалясьцяць на стале ахапкі папераў,
ды запацеўшы глядзяць сьлепа разьбітыя вокны...—

Вось тут умова ляжыць...—
                                        пачаў ў акулярах...
Быццам ударыў віхор у валавяную цішу.
— Не! пастаім да канца за Нарач...
                                                за Нарач!..
— Не! з рыбакоў ні адзін гэтых умоў не падпіша!..

Хтось за сталом гаварыў — крычаў неяк хрыпла.
Хата шумела, як бор:
                                    шумна з размахам і гулка...
Тлум, як рака ў крыгалом, нястрыманы выплыў,
хваляй расплыўся, пайшоў бурна вясковаю вулкай...

3.

Над гарамі, пераваламі,
   над разорамі і хатамі,
      над глухімі пералескамі,
         над лясамі над кудлатымі, —

гасьлі зоры, загараліся,
   дні ўставалі і хаваліся...
      Эх! і моладасьць адзіная
         расьцьвіла ў садох рабінаю...

Расьцьвіла... а можа восеньню
   яе скосяць ветры чорныя
      што гуляюць над вазёрамі,
         над Старонкай непакорнаю?..

Ці мо скутая і босая
   пройдзеш сьцежкамі, палосамі,
      незнаёмымі разлогамі,
         невядомымі дарогамі?..

І пачнеш блудзіць ты песьнямі
   зноў над нівамі узорнымі,
      на размашыстых гармоніках,
         тэнарамі непакорнымі...

— — — — — — — — — —

Быў пагодны хоць ветраны час.
На шырокім, на Мядзельскім рынку
надрывалася хрыпла катрынка,
пачынаўся вясеньні кірмаш.

Быццам войска, пасталі вазы,
на парадзе ці можа на вечы,
з тлуму шэрага — з шэрай лазы
лес аглобляў падняўшы на плечы.

Як зара і як неба паркаль
усьмяхаўся з палатак да сонца
і каралі, як сьлёзы ці жаль,
расьцьвілі дзе-нідзе на сарочцы.

Вецер
пальцамі перабіраў
з гарманістым густыя частушкі
і вясёлкі — калёрныя стужкі —
быццам ў косы дзяўчат уплятаў...

На шнурох вісяць лапці, кнаты,
а вышэй — на падмостках
і ганках —
скуры жоўтыя і хамуты
і — як сонца — вянкі абаранкаў...

Плешчыць
мора людзкіх галасоў...
— Гэй, тавар заграні́чны, парыскі!..
І кудакчаць між цесных вазоў
бабы шумна купляючы міскі.

— Як задарма тавары мае!..
Шоўк дзяўчаты ускінуць на грудзі...
— Гэй, купі чорнабрывай сваей, —
будзе моцна любіць,
не забудзе!..

4.

Грышка доўга па рынку хадзіў,
прыглядаўся дзявочым уборам.
Хустку, не таргаваўся, купіў, —
сіні шоўк з пералівам вазёраў.
Добра — блізка дзяўчат ня было:
Бо з кірмашу-б яшчэ не прыехаў —
раззваніла-б у лапці сяло,
было-б вечарам гутаркі, сьмеху...

Іван

Што-ж, прыехаў і ты на кірмаш?
Даўна стужкамі стаў любавацца?..

Прахор

Кінь, Іван, чалавек гэта наш!
І пашто усё лезеш спрачацца?
А табе гэтак, Грышка, хадзіць
на вачох я ні раджу ніколі...
Тут пранюхаюць, будуць сачыць, —
у мястэчку, брат, ведай, ня ў полі.
Ды пайдзём!
Каля крайніх вазоў
ўжо чакаюць сабраўшыся людзі,
шмат баторынскіх ёсьць рыбакоў,
нехта з Гатавіч, з Пасынак будзе...

Грышка

Бачыш... куць профсаюз пачалі.
Справу толькі падняць было гора.
Сіла толькі куецца ў агні;
хутка бура падыме вазёры...

Рынак пеніцца,
рынак шуміць,
шматкалёрны і шэры і зрэбны.
Сонца лушчыцца, сонца гарыць
на люстэрках,
на хустках, на грэбнях.

Бабы кужаль, маткі прадаюць,
дываны, ручнікі, палатніны...
І калі яны зноў напрадуць —
ўсё, што выцягнуў голад на рынак?..
Польнай сьцежкай
цьвітуць паяскі,
разшытыя кашулі і стужкі
ў каляровыя дзіўныя птушкі,
ў каласы, верасы, васількі...
Ў тлуме тонуць палаткі, рады.
Ўсё зьмяшалася — людзі і коні.
Вецер з Мястра
вільготны, густы
ў залатыя шарахаўкі звоніць...
— Гэй, купіце прыборы хутчэй!..
Не, купец не маніў, не марудзіў,
ведаў: хлопца любіць весялей
чорнабрывая
з хустачкай будзе...

5.

Шмат гаварылі
і птушкі, і ветры,
і верасы расьцьвітаючы ў нетрах
далёкіх;
або начамі пужлівыя зоры
мыючы вочы ў
крыштальных вазёрах
глыбокіх...

Шмат гаварылі
батрацкія нівы
гонючы хвалямі ў даль пералівы
зарою,
быццам нядолю радзімай Старонкі;
шмат гаварылі
бярозы, сасонкі
і хвоі,
песьні, што блудзяць па стоптаным полі —
нам гаварылі аб Волі...

Праўда, што сокалаў
шмат ужо пала
восеньню скошаных чорнай навалай
па сьвеце...

Але на слаўных, народных магілах
ўсталі бунтарныя новыя сілы —
іх дзеці.
Ў сэрцы няма
іх пакоры, трывогі...

Гэткія толькі вазьмуць перамогу
хоць з бою...

Вецер калыша трысьнік надвазёрны;
ціха бор дрэміць
над возерам чорны,
і хвоі
часам зашэпчаць аб чымсь мімаволі
гледзячы ў сіняе поле...

— — — — — — — — — — — —

Ні галасоў, ні гоману
ў нахлынуўшым тумане
з над возера Баторына...
Сядзіць адна Тацяна.

Заснулі даўна вуліцы,
і толькі адгалосы
дзе-недзе яшчэ чуюцца
спазьніўшыхся калёсаў...

Зара ў вадзе хаваецца,
мігцяць радкія зоры...
Дзяўчына прыслухаецца,
што Мястра ей гавора.

А хвалі пераліўныя
пяшчотна галасамі
шапочаць казкі дзіўныя
з густымі трысьнікамі...

Пад вербамі і вязамі
ўсё плёскаюць бяз зьмены
і цешацца алмазамі
змываючы іх пенай.

Здаецца хвалі змучаны,
і вецер з трысьнікамі,
і возера магучае
сьпіць, дыхае грудзямі.

А месяц пераломаны
калышыцца ў тумане,
што пераплыў з Баторына...
Сядзіць адна Тацяна...

6.

Грышка

Прыйшлі...
што, доўга нас чакала?
Сход зацягнуўся да пазна...
Што-ж, Кагарка, не сумавала
над Мястрам—возерам адна?..

Тацяна

Дамоў ісьці была гатова,
або на лодках уцячы...

А вочы зарацца з пад броваў,
як першы
золак у начы.

Прахор

Ну, хлопцы, —
ў даль па моры сінім!
Ў сяло вярнёмся да зары.
А ты, Арол, глядзі — дзяўчыны
у рыбакоў не забяры!..

І пырснуў сьмех
разьбітай хваляй
закалыхаўшы трысьнікі.
І песьню дружна запяялі
на першых лодках рыбакі.
Ў даль паплыло
па хвалях рэха,
туды, дзе цёмны бор стаіць,
дзе сумна дрэмяць хаты, стрэхі...
Эх, песьні родныя мае!..

7.

— Трэба вёсламі ударыць —
зноў Прахор гавора.

Лодкі выплылі на Нарач, —
Эх, на сіне мора!

Лес над берагам сагнуўся,
зоры расьцьвітаюць...

„Паляцелі белы гусі
ды з чужога краю“...

Грышка

Слухай, суджана так мусіць,
што цябе кахаю,
а ты, быццам тыя гусі,
ад мяне ўцякаеш...

Не работнік можа ў полі?—
Жыць мы будзем працай,
За вазёры і за Волю
ў грамадзе змагацца...

Ціха Кагарка паўноччу
песьню абарвала,
за шаўковай хусткай вочы
зорныя схавала.

— Дык і я цябе кахаю... —
быццам шопат сосны
ўскалыхнуў вазёрнай хваляй,—
кінуў Грышка вёслы...

— Што-ж там песьню абарвалі?—
зноў Прахор гавора.—
Панясласся песьня далей,
рэхам па вазёрах!

То падняўшыся высока
        блудзіць за гарамі,
або спусьціцца, як сокал,
        дзесь за трысьнікамі...

Вецер з шолахам прачнуўся,
        вецер навявае:
„Вы пастойце, белы гусі, —
        я вас запытаю“...

Канец часткі чацьвертай.

Вільня, 10. IX. 36.

Сьвяткаваньне юбілею Коласа
ў Менску

Усё грамадзянства і розныя установы БССР вельмі ўрачыста адзначылі юбілей 30-гадовай літаратурнай дзейнасьці народнага паэта Якуба Коласа. Пачынаючы з першых дзён кастрычніка, у працягу месяца, былі ладжаныя юбілейныя акадэміі ў розных установах усяе БССР, а нават і ў СССР, дзе толькі існуюць якія-колечы беларускія культурна-прасьветныя ўстановы (прыкл. у Маскве, Ленінградзе і інш.).

Найболей урачыстая акадэмія была зладжана дня 11-га кастрычніка ў БССР, у Менску. Акадэмія адбылася ў салі І-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру, перапоўненай грамадзянствам з Менска, дэлегатамі з розных пунктаў БССР і прадстаўнікамі іншых рэспублік СССР.

Юбілейная ўрачыстасьць перадавалася праз менскую радыёстанцыю.

У прэзыдыюм акадэміі былі пакліканы наст. асобы: Якуб Колас, Гікала (сэкратар КП(б)Б — быў няпрысутны), Галадзед — старшыня СНК БССР, Чарвякоў — старшыня ЦВК БССР, Сурта — прэзыдэнт Акадэміі Навук БССР, Дзякаў—Нарком асьветы БССР, Янка Купала, А. Александровіч — паэты, Туранкоў — кампазытар і цэлы рад іншых асоб.

Акадэмію адчыніў Нарком асьветы Дзякаў, які ў кароткіх словах абзнаёміў прысутных з біографіяй Якуба Коласа. Далей былі прачытаны прывітальныя тэлеграмы ад розных установаў і асоб. Першая тэлеграма была ад сэкратара КП(б)Б — Гікала. Тэлеграма была зрэдагавана і адчытана ў расейскай мове!

Па адчытаньні тэлеграмы Гікала, прэзыдыюм акадэміі абвесьціў пастанову ўраду БССР, якой Я. Колас атрымлівае нагароду ў форме дачы, дому, у якім цяпер пражывае ў Менску, і лёгкага аўтамабілю, якога кошты ўтрыманьня бярэ на сябе ўрад БССР.

Далей віталі паэта вучнёўская моладзь з Менску, пасьля выступіў з абшырным рэфэратам аб жыцьці і дзейнасьці Я. Коласа кіраўнік справамі мастацтва пры СНК БССР П. Пасюкевіч.

Пасьля рэфэрату Пасюкевіча далей былі чытаны прысыланыя прывітальныя тэлеграмы.

Трэба сьцьвердзіць, што зашмат было расейшчыны ў прывітаньнях, тым больш, што карысталіся расейскай мовай мясцовыя прадстаўнікі розных установ і арганізацый БССР. Парасейску напр. вітаў Ткачэвіч—ад імя Цэнтр. Каміт. КП(б)Б, тэлеграму ў расейскай мове ад старшыні СНК БССР Галадзеда прачытаў праф. Бранштэйн Якуб, парасейску ад Акадэміі Навук БССР вітаў прэзыдэнт Акадэміі Сурта, ад імя тэатраў вітаў Рафальскі і інш.

Пабеларуску віталі: вучнёуская моладзь з Менску, дэлегацыя стаханаўцаў з Менску, дэлегацыя друкароў друк. ім. Сталіна дэлегацыя ад менскіх настаўнікаў.

Ад імя пісьменьнікаў і паэтаў БССР доўгай і вельмі рачова прамовай прывітаў хораша пабеларуску паэт Александровіч.

Далей вітаў юбіляра народны паэт Янка Купала. Ён сваё прывітаньне ўлажыў у форму верша.

З найбольш рачовых прывітаньняў гасьцей — гэта глыбо і сэрдэчнае прывітаньне Ал. Суркова — ад імя Саюзу Савецкі Пісьменьнікаў.

Суркоў параўнаў Коласа і Купалу да вялікага расейскага паэта А. Пушкіна. Зазначыў, што творчасьць Коласа і Купалы ў беларускай літаратуры адыгрываюць такую ролю, як у расейскай літаратуры творчасьць Пушкіна. А веліч Коласа і Купалы ў тым, што яны ніколі не адрываліся і не адрываюцца ад народу; мову сваей творчасьці жывяць сокамі жывой беларускай мовы.

Цёплымі прамовамі прывіталі юбіляра украінскія паэты і пісьменьнікі Тычына, Масэнка і Лэ.

Ад пісьменьнікаў „Западной Области“ — гэта знача Смаленшчыны — вітаў юбіляра пісьменьнік Кудзімаў.

Дзіўна, што Кудзімаў вітаў Коласа, як прадстаўнік небеларускай зямлі, хоць Смаленшчына, якая прылучана да РСФСР, якраз зьяўляецца інтэгральнай часткай этнографічнай Беларусі.

Пасьля з адказам на ўсе прывітаньні выступіў сам юбіляр-Я. Колас.

Прамоўца коратка спыніўся над гісторыяй навейшай беларускай літаратуры за апошнія 30 гадоў, сьцьвярджаючы яе буйнае разьвіцьцё.

П. М.

Наступная кніжка „Калосься“ выйдзе з друку ў палавіне першага кварталу 1937 году.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: Ян Шутовіч.

Выпісывайце, чытайце, пашырайце адзіны ў заходне-беларускіх землях літаратурна-навуковы квартальны часапіс

„КАЛОСЬСЕ“

Кожны нумар „Калосься“ друкуецца нармальна на чатырох аркушох паперы — на 64 бачынах.

„Калосьсе“ выходзіць ужо 2 гі год і акуратна раз у тры месяцы, зьмяшчае цікавы мастацка-літаратурны і навуковы матарыял.

У „Калосьсі“ друкуюцца творы перадавых заходне-беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў — творы Натальлі Арсеньневай, Міхася Машары, Максіма Танка, А. Бярозкі і інш., а так-жа перадрукоўваюцца творы перадавых пісьменьнікаў Усходняй Беларусі

У „Калосьсі“ зьмяшчаюцца артыкулы з усіх галін беларускай культуры, а так жа падаецца багатая хроніка.

Хто ня зможа аплаціць „Калосься“ сам, няхай зложыцца з іншымі.

Складка на „Калосьсе“ ў год – 2 зл., асобны нумар — 50 гр.

„Калосьсе“ высылаецца толькі па атрыманьні складкі.

Адрас рэд. і адм. „Калосься“ — **Вільня, Завальная 1—2.**

Гадавікі „КАЛОСЬСЯ“

за 1935 і 1936 г.

можа дастаць кожны, хто прышле за паасобны гадавік складку 2 зл.

„Калосьсе“

павінна быць настольным часапісам **кожнага Беларуса!!!**

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA